

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ: ДА ЧАГО РЫХТАВАЦЦА?

ЧЫРВОНКА



КІБЕРСПОРТ. ЗАСВОЙВАЮЧЫ ПРАСТОРУ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛЮТАГА 2020 г. ЧАЦВЕР № 39 (29153)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ніклас КАРЛСАН, генеральны сакратар IBU (на цырымоніі адкрыцця чэмпіянату Еўропы па біятлоне ў Раўбічах):**

*«Ад імя Міжнароднага саюза біятланістаў хачу павіншаваць арганізацыйны камітэт, ён змог у такія кароткія тэрміны, насуперак цяжкім умовам арганізаваць спаборніцтва. Вашы старанні і аб'ём праведзенай работы ўражваюць. Раўбічы — гэта выдатная пляцоўка для правядзення чэмпіянату Еўропы і іншых міжнародных спаборніцтваў па біятлоне».*

## КОРАТКА

- **Абвешчаны інтэлектуальны конкурс «MobiКвіз», пераможца якога адправіцца ў Оксфард.**
- КДК не выявіў сур'ёзных парушэнняў у налічэнні зарплаты бюджэтнікам пасля ўвядзення новай сістэмы.
- **Новыя навучальныя дапаможнікі па сусветнай гісторыі і грамадазнаўстве выдадзеныя ў Беларусі.**
- Пілотны праект па развіцці 5G рэалізуюць у «Вялікім камяні».
- **Васьмігадовая беларуска Мая Сівец перамагла ў прэстыжным конкурсе харэаграфіі ў Германіі.**
- Тэхналогію хатняга маніторынгу плода ўкараняць для цяжарных у Мінскай вобласці.
- **Зуброў у Белавежскай пушчы плануюць лічыць з паветра.**
- Першыя ўкусы кляшчоў зарэгістраваныя ў Брэсцкай вобласці.
- **Расія выдзеліла Беларусі квоты на вылаў рыбы ў Баранцавым і Балтыйскім морах на 2020 год.**

ISSN 1990 - 763X

20039>

# НА СВАЁЙ ГАСПАДАРЦЫ



Анатоль і Фаіна ДЗЕНІСЮКІ разам сорак пяць гадоў. Як толькіселі за студэнцкую парту тады яшчэ ў ветінстытуце ў Віцебску, так больш і не расставаліся. Пасля заканчэння вучобы Дзенісюкі трапілі ў вёску Машканы Сенненскага раёна, у знакаміты саўгас імя Машэрава, дзе прапрацавалі каля 40 гадоў — і ветурачамі, і на кіруючых пасадах. Увесь час разам, выгадавалі дваіх дзяцей. Цяпер Фаіне Карпаўне 64, а Анатолю Фёдаравічу 63 гады. Жывуць яны ва ўласным доме, дзе ўсё зроблена сваімі рукамі.

**Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.**

*Аўтарка гэтага фота Таццяна ТКАЧОВА гэтымі днямі гераіня многіх навін. Фотакарэспандэнт «Звязды» стала фіналісткай найпрэстыжнейшага ў свеце міжнароднага фотаконкурсу. (Падрабязней пра гэта — на 3-й старонцы.)*

Праблемы і рашэнні

## ФЕРМЕРЫ ПРОСЯЦЬ ЗЯМЛІ

### Яе выдзяленне практычна прыпынена

**Ці працуюць механізмы дзяржаўнай падтрымкі фермераў на месцах? Што перашкаджае ў поўнай меры раскрыцца патэнцыялу прадпрымальнікаў, якія працуюць на зямлі? Якія галіны сельскай гаспадаркі неабходна развіваць на прыватнай аснове? Якія рэгіёны найбольш прыцягальныя для сельскага бізнесу? Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі кіраўнікі сялянскіх фермерскіх гаспадарак з кіраўніцтвам і спецыялістамі Мінаблвыканкама ў фармаце круглага стала.**

### РАЗВІВАЕЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА — РАЗВІВАЮЦЦА ТЭРЫТОРЫІ

**Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ** паведаміў, што ў вобласці функцыянуе 1025 сялянскіх і фермерскіх гаспадарак, за апошнія пяць гадоў іх колькасць павялічылася на 7 %. Ім належыць амаль 50 тысяч гектараў зямлі, якая ў сярэднім штогод прырастае на 5 %. Большасць фермераў займаецца вытворчасцю бульбы і агародніны. Яны вырошчваюць больш за 20 тысяч тон «другога хлеба» ў год, або 20 % ад агульнай колькасці ў вобласці. Летась фермеры атрымалі 145 тысяч тон агародніны, што склала 50 % ад агульнага аб'ёму. Яе ўраджайнасць і якасць нават вышэйшыя, чым у сельгасарганізацыях.

— Я прыхільнік таго меркавання, што фермерскі рух здольны зрабіць значны ўнёсак у прырост нашай эканомікі. Сельскае прадпрымальніцтва спрыяе развіццю сваіх тэрыторый, павелічэнню даходаў насельніцтва, падатковых паступленняў у мясцовыя бюджэты і, самае галоўнае, вырашае праблемы занятасці насельніцтва, — лічыць **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

СТАР. 4

Май на ўвазе!

## «Гібрыдныя» адпраўленні і каштоўныя пакеты

### Сёлета ў Беларусі змяніліся правілы аказання паслуг паштовай сувязі

**Змены ўключаюць у сябе некалькі навацый. Цяпер дакументальна замацавана такая рэч, як «гібрыднае» адпраўленне — гэта значыць, што ліст будзе перасылацца ў электронным выглядзе, а пасля раздрукоўвацца. Наваўвядзенні таксама закранулі і традыцыйныя адпраўленні — пасылкі і іншую карэспандэнцыю. Пра ўсе наваўвядзенні падрабязна расказалі ў прэс-службе РУП «Белпошта».**



— Паштовыя адпраўленні, адрасаваныя непаўналетнім асобам ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў, выдаюцца асабіста адрасату, калі ён прад'явіць дакумент, які пацвярджае яго асобу. Калі ж падлетка няма дома, то адпраўленне можна перадаць яго законным прадстаўнікам без даверанасці. Але ёсць адна ўмова: трэба прад'явіць пасведчанне асобы і дакументы, якія пацвярджаюць сваяцтва ці права законных прадстаўнікоў, заўважылі ў прэс-службе. Тое ж датычыцца і выпадкаў, калі адпраўленне прыйшло малому, якому яшчэ не споўнілася 14 гадоў.

СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

# ЮНЫЯ ГАЛАСЫ Ў ПАЛІТЫЦЫ

## Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Беларусі пачне функцыянаваць ужо ўвесну

**Аб гэтым журналістам паведаміла старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК. На пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу зацверджана палажэнне аб Маладзёжным савеце (парламенце).**

Па словах дэпутата, у склад нацыянальнага маладзёжнага парламента ўвойдуць юнакі і дзяўчаты ва ўзросце 18—31 год — па дзесяць ад кожнага рэгіёна. У першую чаргу гэта перспектыўныя кадравы рэзерв.

«Вельмі важна прыцягваць нашу моладзь да ўдзелу ў палітычным, грамадскім жыцці. І маладзёжная палата будзе добрай пляцоўкай для гэтага», — адзначыў падчас пасяджэння **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**.

# ПЕРАМОЗЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**На вясенняй сесіі адбудуцца парламенцкія слуханні на тэму «75-годдзе Вялікай Перамогі: гістарычная памяць і патрыятызм — самыя важныя маральныя арыенціры беларускага грамадства і дзяржавы, фактары кансалідацыі ва ўмовах сучасных выклікаў і пагроз».**

Па інфармацыі **старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Генадзя ДАВЫДЗЬКІ**, адкрытыя парламенцкія слуханні прапануецца правесці з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, членаў Савета Рэспублікі, прадстаўнікоў дзяржорганаў, грамадскасці, асноўных канфесій, дыпламатычнага корпуса, міжнародных арганізацый.

«Час сапраўды цяпер вельмі няпросты, выбухованебяспечны. І вы бачыце, якое сёння стаўленне да Вялікай Айчыннай вайны, да Перамогі савецкага народа. Таму ўсе гэтыя пытанні трэба несумненна абмяркоўваць, урэшце, на гэта скіравана знешняя і ўнутраная палітыка Рэспублікі Беларусь. Мэта — захаванне гістарычнай памяці, бо перапісванне гісторыі — гэта вельмі небяспечна. І мы мусім захаваць гістарычную праўду, абараніць яе», — падвёў вынікі Уладзімір Андрэйчанка.

Таксама на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў назначаны паўнамоцны прадстаўнік у Канстытуцыйным Судзе Беларусі. Ім стала **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.**

**Варвара МАРОЗАВА.**

Знешняя палітыка

# ПЛЁННЫ ГОД ДЛЯ ДЫПЛАМАТАЎ

## Топ-5 дасягненняў Беларусі ў міжнародных адносінах

**Нарастанне геапалітычнага і геаэканамічнага саперніцтва, непрадказальнасць і напружанасць у міжнародных адносінах, гандлёвыя, санкцыйныя, інфармацыйныя «войны», узмацненне канкурэнцыі за доступ на рынкі і рэсурсы, супярэчнасці гуманітарнага, рэлігійнага і экалагічнага характару, пагроза новага глабальнага геапалітычнага, эканамічнага, ваеннага, ідэалагічнага супрацьстаяння і небяспека «вялікага канфлікту» з удзелам вядучых дзяржаў.**

Гэта не пачатак кнігі-антыўтопіі або фантастычнага фільма пра будучыню нашай планеты, якой неабходны супермэн. Гэта наша з вамі міжнародная рэчаіснасць, у якой беларуская дзяржава будуе вектары знешняй палітыкі. Пералікам такіх непазітыўных перспектыў пачынаецца агляд вынікаў знешняй палітыкі і дзейнасці Міністэрства замежных спраў за мінулы год, які традыцыйна ведамства публікуе ў першыя месяцы новага года. На перадапошнім тыдні лютага праект прэзентавалі прадстаўнікам аналітычнай супольнасці Беларусі. Карэспандэнт «Звязды» зрабіла топ-5 самых важных, на наш погляд, падзей для краіны на міжнароднай арэне.

### 1-е: «Бязвіз»

Прыняты ў 2019-м Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які ўстанавіў новыя падыходы да бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Для грамадзян 73 дзяржаў прадугледжана павелічэнне тэрміну бязвізавага знаходжання ў турыстычных мэтах да 15 сутак. Узгодненыя праекты ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па ўвядзенні бязвізавага рэжыму ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення ў 2021 годзе ў Мінску Чэмпіянату свету па хакеі з шайбай, Сусветнай шахматнай алімпіяды 2022 года і іншых спартыўных мерапрыемстваў (на 2020—2022 гады).

### 2-е: Аўстрыя нам сябар

Дасягнуў беспрэцэдэнтнага ўзроўню палітычны дыялог з Аўстрыяй. Адбыўся першы ў гісторыі двухбаковых адносін афіцыйны візіт у гэтую краіну Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Наведалі нашу краіну Федэральны канцлер Аўстрыі Себасцьян Курц, Федэральны міністр па пытаннях Еўропы, інтэграцыі і замежных спраў Карын Кнайсль. Падчас візіту беларускага лідара ў Вену адбыўся шчыры дыялог з бізнесам Аўстрыі. Прэзідэнт запрасіў іх працаваць у нашай краіне, але сумленна і справядліва, як яны гэта робяць на радзіме.

### 3-е: Візіт Ігара Петрышэнкі ў Літву

Рыторыка літоўскага боку ў дачыненні да будаўніцтва Беларускай АЭС застаецца фактарам, які стрымлівае развіццё двухбаковых палітычных і міжведамасных кантактаў. Перадумовай для аднаўлення палітычнага дыялогу неабходна разглядаць першы за некалькі гадоў візіт у Літву дзеяча высокага ўзроўню з Беларусі — намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. Ён удзельнічаў у цырымоніі перапахавання астанкаў Кастуся Каліноўскага ў Вільнюсе і правёў перагаворы з кіраўніцтвам краіны.

### 4-е: Аднаўленне дыялогу з ЗША

У мінулым годзе адразу два значныя палітыкі са Злучаных Штатаў Амерыкі прыехалі ў Беларусь — дарадца Прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Джон Болтан (які ў хуткім часе завяршыў сваю кар'еру ва ўладзе), намеснік дзяржсакратара ЗША па палітычных пытаннях Дэвід Хэйл. Па выніках яго візіту заяўлена аб намеры аднавіць двухбаковыя дыпламатычныя адносіны на ўзроўні паслоў. Праз некалькі месяцаў ужо ўпэўнена аб гэтым скажа і сам Дзяржаўны сакратар Майкл Пампеа. Але гэта гісторыя ўжо сёлетняя.

### 5-е: Прарыў у візавых пытаннях з Еўрапейскім саюзам

Наведвалі Беларусь з афіцыйнымі візітамі еўракамісар па бюджэце і кадравых рэсурсах Гюнтар Эцінгер, члены Еўрапарламента і іншыя чыноўнікі высокага рангу з Еўрапейскага саюза. Нягледзячы на актыўныя кантакты, доўгі час пытанні аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю віселі ў паветры — аж з 2014 года. Але перагаворы з ЕС аб спрашчэнні выдачы віз і рэадмісіі ўсё-такі завершаны. Пагадненне падпісана ў Брусэлі ўжо ў гэтым годзе — восьмага студзеня. На жаль, выканаць усе працэдуры па падаражанню коштаў шэнгенскіх віз з 60 да 80 еўра не ўдалося. Цяпер чакаем, калі дакументы будуць ратыфікаваны Нацыянальным сходам Беларусі і ўхвалены Еўрапарламентам. Пачне дакумент дзейнічаць у першы дзень другога месяца пасля даты паведамлення бакамі аб завяршэнні працэдур. Чакаецца, што адбудзецца гэта ў чэрвені.

* * *

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ назваў мінулы год даволі напружаным, але выніковым. На яго думку, ведамства змагло захаваць, а месцамі істотна нарасціць тэмпы і аб'ёмы дыпламатычнай работы.**

Яе вынікі за 2019 год падвялі на пашыраным пасяджэнні калегіі МЗС.

«Дынамічна развівалася двухбаковае ўзаемадзеянне з нашымі замежнымі партнёрамі на ўсіх трэках. Захоўваючы прыхільнасць да безумоўнага выканання сваіх абавязацельстваў у адносінах да Расіі — нашага стратэгічнага саюзніка і асноўнага гандлёвага партнёра, — Беларусь прадоўжыла ўмацоўваць пазітыўную тэндэнцыю да нармалізацыі адносін на еўра-атлантычным вектары», — сказаў Уладзімір Макей.

У МЗС выдатна разумеюць, што на цяперашнім этапе прыярытэт іх работы — знешнеэканамічны напрамак. Міністр канстатаваў, што з-за ўвядзення Расіяй абмежаванняў на вываз нафтапрадуктаў і паставак бруднай нафты экспарт Беларусі знізіўся на $2 мільярды 55 мільёнаў.

«Для выхаду на ўстаноўлены кіраўніком дзяржавы параметр экспарту тавараў і паслуг — 105,4 працэнта — нам неабходна было забяспечыць рост па таварах на чатыры працэнты. Па факце экспарт тавараў склаў $32,9 мільярда і зменшыўся на 2,9 працэнта, або на $970,5 мільёна», — перадае словы міністра БелТА.

Уладзімір Макей таксама адзначыў зрухі ў дыялогу з ЗША, прагматычнае ўзаемадзеянне з Еўрасаюзам, інтэнсіўнае супрацоўніцтва з краінамі СНД. Міністр звярнуў увагу, што Беларусь працягвае дэманстраваць свой патэнцыял у забеспячэнні эфектыўнай работы інтэграцыйных аб'яднанняў — ЕАЭС, СНД, АДКБ, а таксама міжнародных арганізацый, перш за ўсё ААН і АБСЕ.

**Марыя ДАДАЛКА.**


**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

**Продавец:** государственное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» (УНП 690608054) в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ», тел. +375 (17) 395-81-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **13 марта 2020 г.** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль GAZ-32213 (рег. знак АК 0737-5), 2010 г. в. | 4320,00 |
| 5 | Кран башенный | 9165,00 |
| 6 | Станок 4-строгальный | 3380,00 |
| 7 | Пилорама Р63 4 Б | 3250,00 |
| 8 | Станок угло-зачист. СА-606 | 1755,00 |
| 9 | Машина двухгол. DK 502 | 3380,00 |
| 10 | Стол для раскроя стекла | 13 650,00 |
| 11 | Пила для резки дистанц.проф. | 2275,00 |
| 12 | Экструдер гидравлический | 21 320,00 |
| 13 | Оборудование для засыпки сита | 2015,00 |
| 14 | Кондиционер для охлаждения | 3705,00 |
| 15 | Бутилэкструдер 7,5 кг | 10 205,00 |
| 16 | Авт. линия для производства стеклопакетов | 38 870,00 |
| 17 | Электропневматический стол | 2860,00 |
| 18 | Двухголовочная пила | 5200,00 |
| 19 | Пресс ZPX 14378 | 1950,00 |

Местонахождение: Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73, тел. для осмотра 80296055342.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 28.02.2020 г. с 09.00 по 12.03.2020 г. до 17.00: 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, заключить договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам торгов. Срок оплаты предмета торгов: по условиям договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 21.01.2020 г.



**Акционерам ОАО «Лукомльэнергомонтаж», 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8**

**Извещение о созыве очередного (годового) общего собрания акционеров**

Собрание состоится **20 марта 2020 г. в 10.00** по адресу: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 08.00 до 09.45. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 1 марта 2020 года. Орган, созывающий собрание: Наблюдательный совет. Основание созыва собрания: решение Наблюдательного совета от 15 февраля 2020 г. (протокол № 2).

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2019 году и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год.
2. Об утверждении годового отчета Общества, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества, с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли (покрытия убытков), выплате дивидендов за 2019 год и направлений распределения прибыли на 2020 год и 1-й квартал 2021 года.
4. Об избрании членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
5. Об утверждении условий вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О приобретении Обществом акций собственного выпуска.
7. Об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования акций, поступивших в распоряжение Обществом в целях сокращения их общего количества.
8. О внесении изменений в Устав Общества.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 28 февраля 2020 г. в бухгалтерии Общества с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания с 08.00 до 09.45 – по месту его проведения.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров – также документов, подтверждающих полномочия на участие в собрании.

УНП 300007839



**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает,**

**что очередное общее собрание акционеров состоится 30 марта 2020 года по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4. Начало собрания в 14.00.** Регистрация акционеров с 13.30 до 13.55. При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и основных направлениях деятельности на 2020 год.
2. О рассмотрении отчета наблюдательного совета Общества за 2019 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности о деятельности Общества за 2019 год.
5. О распределении прибыли Общества за 2019 год и выплате дивидендов за 2019 год.
6. О направлениях использования прибыли на 2020 год и первый квартал 2021 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2020 году.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
9. О внесении изменений в устав Общества.

Тел. 220-59-17.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».

УНП 600013173

Блізкая ўлада

# КАНТРОЛЬ І РАШЭННЕ ПЫТАННЯЎ

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА правёў выязны прыём грамадзян у Круглым Магілёўскай вобласці.**



Фота БелТА.

«Выязныя прыёмы дазваляюць кантраляваць, як выконваюцца рашэнні Прэзідэнта і ўрада на месцах. І такія прыёмы павінны праводзіць усе належныя асобы — і рэспубліканскага, і мясцовага ўзроўню. Акрамя кантролю гэта дазваляе вырашаць бягучыя пытанні насельніцтва і тыя, што набылі хранічны характар. Важна ведаць, што турбуе людзей у канкрэтных населеных пунктах, і разумець, чым можна ім дапамагчы», — сказаў Ігар Сергеенка.

На прыёме часцей за ўсё гучалі пытанні ЖКГ і добраўпарадкавання, звярнуўся да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта і мясцовы індывідуальны прадпрымальнік. Усяго на прыём прыйшлі амаль два дзясяткі жыхароў Магілёўскай вобласці. Многія з пытанняў узятыя на кантроль, нейкія спрэчкі могуць вырашыць самі людзі — трэба толькі знайсці кампраміс.

Ігар Сергеенка ўдакладніў, што ўсяго летась у Адміністрацыю Прэзідэнта паступіла каля 2,5 тысячы зваротаў ад жыхароў Магілёўскай вобласці.

**Паводле БелТА.**

Камунальныя стасункі

# ЦЁПЛАЯ ЗІМА = ТАННЫЯ ЖЫРОЎКІ?

## Як плюсавая тэмпература паветра адбілася на спажыванні цяпла

**Нягледзячы на тое, што на пачатку года тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі традыцыйна «пайшлі ўверх», у Цэнтры інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама адзначаюць, што гэта не перашкодзіла беларусам сэканоміць сродкі на ацяпленні з-за плюсавай тэмпературы.**

— Як правіла, студзень — самы халодны месяц, і летась сярэдняя тэмпература складала мінус 5,1 градуса. У 2020 годзе яна паднялася ўжо да плюс 1,2. Менавіта таму розніца ў спажыванні цяпла такая істотная, — тлумачыць **намеснік начальніка абаненцкага аддзела філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр г. Мінска» Таццяна МІКУЛІЧ.** — Такой розніцы паміж жыроўкамі за снежань мінулага і гэтага года вы не ўбачыце, бо сярэдняя тэмпература паветра ў гэтыя месяцы амаль ніяк не адрознівалася.

Напрыклад, на ацяпленне тыпавой двухпакаёвай кватэры, дзе ёсць зарэгістраваныя жыхары, у студзені мінулага года было затрачана 1,0592 гігакалорыі, а ў студзені 2020 года — ужо 0,7747. Гэта значыць, што летась уласнікі кватэры аддалі за цяпло 17,93 рубля, а сёлета — 14,32, нягледзячы на традыцыйнае павышэнне тарыфаў. За такую ж кватэру (пры аналагічным спажыванні цяпла), дзе няма зарэгістраваных жыхароў, у 2019 годзе налічылі 97,71 рубля, а ў 2020-м — 68,94.

Аднак спецыялісты Цэнтра інфармацыйных тэхналогій адзначаюць, што нават за студзень гэтага года менавіта такую эканомію атрымаюць не ўсе ўласнікі. Калі ў доме адсутнічае прыбор групавога ўліку цяпла, то аплату будуць лічыць па сярэдніх нарматывах. У мінулым ацяпляльным перыядзе Мінгарвыканкам устанавіў нарматыў у 0,0186 гігакалорыі за квадратны метр, у цяперашнім — 0,0184.

А вось у канцы ацяпляльнага сезона некаторых уласнікаў традыцыйна чакае пераразлік. Найбольшую выгаду атрымаюць тыя жыхары, у дамах і кватэрах якіх устаноўлены прыборы групавога і індывідуальнага ўліку цяпла і тэрмарэгулятары (пры ўмове, што яны эканомілі цяпло). Пэўную эканомію атрымаюць і ўласнікі, у дамах якіх няма нават прыбораў групавога ўліку. Як адзначылі ў Цэнтры інфармацыйных тэхналогій, звычайна ім вяртаюць грошы за фактычныя нарматывы на ацяпленне аднаго квадратнага метра, а калі ўлічваць цёплую зіму, яны будуць ніжэйшыя за леташнія.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

**❍ ДАВЕДКА**

Нягледзячы на плюсавую тэмпературу ў студзені гэтага года, трэба адзначыць, што камунальнікі нясуць тыя ж затраты на ацяпленне, што і летась. У Мінсккамунцеплаісетцы адзначылі, што цёплая зіма дапамагла ім істотна сэканоміць на паліве, але фактычна прадпрыемства панесла такія самыя затраты — кацельні працуюць у тым жа рэжыме. Больш за тое, сабекошт паслугі ў такіх выпадках можа нават вырасці, бо крыніцы не адпускаюць звычайны аб'ём цяпла. Цана ў рублях можа захавацца, але ў пераводзе на гігакалорыі, наадварот, стаць вышэйшай.





Фота БелТА.

# ПЕРШЫ ДЗЕНЬ — ПЕРШЫ МЕДАЛЬ

## Сяргей Бачарнікаў стаў чэмпіёнам Еўропы па біятлоне

**Учора турнір у Раўбічах стартаваў з суперспрынту, агульная колькасць удзельнікаў у кваліфікацыйных стартах — больш за дзвесце чалавек. Па трыццаць найлепшых спартсменаў сярод мужчын і жанчын адабраліся ў фінальную частку.**

Сярод мужчын туды прабілася трое беларусаў. Антон Смольскі паказаў найлепшы вынік у кваліфікацыі, Віктар Крыўко размясціўся на трэцяй пазіцыі, а Сяргей Бачарнікаў стаў 17-м. Аднак у фінале гаспадары чэмпіянату памяняліся лідзіруючымі пазіцыямі, пасля апошняй стральбы гонку ўзначаліў Сяргей Бачарнікаў, які ва ўпартай барацьбе да апошніх сантыметраў дыстанцыі здолеў утрымаць сваю перавагу.

— Я даўно чакаў асабістага медаля ў буйных спаборніцтвах. Раўбічы — даволі шчаслівае месца для мяне, але пастаянна не дацягваў да асабістай узнагароды. Пасля пераносу чэмпіянату ў Беларусь сёлета ў мяне з'явіўся яшчэ адзін шанц, і я яго выкарыстаў. Апошні ўздым пераадольваў на зубах, чуў, што трэнеры падганяюць сапернікаў. Але я рызыкнуў і ўсё атрымалася, — радасна адзначыў Сяргей.

У жанчын права пазмагацца за першыя ўзнагароды чэмпіянату ў фінале атрымала Ірына Крыўко, Дзінара Алімбекава, Ганна Сола і Адэліна Сабітава. Найбольш удала выступіла тут Ірына Крыўко, якая заняла 8-е месца.

— Траса вельмі цяжкая, нават на спусках ты не можаш адпачыць, трэба працаваць, — адзначыла пасля гонкі Ірына Крыўко. — У цэлым выступаць пасля чэмпіянату свету складана і фізічна, і псіхалагічна, таму што там, на жаль, не атрымалася добра паказаць сябе. Аднак як ёсць, будзем змагацца далей.

Сваю ацэнку першаму дню турніру даў і ганаровы госць, алімпійскі чэмпіён Аляксандр Папоў: «Трэба прызнаць працавітасць арганізатараў, у такіх складаных умовах яны змаглі падрыхтаваць і ўтрымаць трасу. Гэта каласальная праца, вялікі ім дзякуй. Але спартсменам падчас спаборніцтваў трэба быць вельмі ўважлівымі, таму што на спусках можа праступаць вада і лыжы будуць спыняцца, а на ўздымах снег можа праслізгваць».

Сёння, у другі дзень спаборніцтваў чэмпіянату Еўропы па біятлоне, адбудзецца сінгл-мікст і змешаная эстафета.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Урон сусветнай эканоміцы ад пандэміі каранавіруса ацанілі ў $1 трлн

Агульнасусветны ВУП у 2020 годзе скароціцца на $1,1 трлн (1,3 працэнта), калі ўспышка каранавіруса ператворыцца ў сусветную пандэмію — шырока распаўсюджаную і моцную эпідэмію. Такія разлікі прадставіла аналітычная кампанія Oxford Economics. Яна дадала, што ў гэтым выпадку ў эканоміцы ЗША і краін Еўразоны пачнецца рэцэсія. Паводле другога магчымага сцэнарыя, які прадугледзела Oxford Economics, выбухне пандэмія толькі ў Азіі. У гэтым выпадку сусветная эканоміка панясе ўрон у $400 млрд (0,5 % ВУП). Страты стануць следствам нявыхаду супрацоўнікаў прадпрыемстваў на працу, памяншэння прадукцыйнасці, скарачэння турыстычнай актыўнасці і паездак, парушэння ланцужкоў паставак і скарачэння гандлю і інвестыцый, піша са спасылкай на даследаванне Bloomberg. Oxford Economics лічыць, што шкода ад глабальнай пандэміі будзе «кароткім, але вельмі вострым шокам для сусветнай эканомікі».

### У беспарадках на вуліцах Нью-Дэлі загінулі дзясяткі чалавек

У індыйскай сталіцы за апошнія дні загінулі не менш за 20 чалавек, яшчэ каля 190 пацярпелі ў выніку беспарадкаў, якія пачаліся пасля таго, як быў прыняты новы закон аб грамадзянстве, паведамілі індыйскія СМІ. Галоўны міністр Нью-Дэлі Арвінд Кеджрывал назваў сітуацыю ў горадзе «трывожнай» і заявіў, што трэба заклікаць вайскоўцаў, каб узяць сітуацыю пад кантроль. У найбольш пацярпелых раёнах Дэлі назіраецца ўзмацненне прысутнасці сіл правапарадку. Пратэсты супраць новага закона аб грамадзянстве пачаліся ў снежні мінулага года адразу пасля яго прыняцця. Крытыкі апасаюцца дыскрымінацыі мусульман. У сталіцы Індыі зафіксаваныя падпалы мячэцяў. Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі заклікаў жыхароў сталіцы «захоўваць мір і братэрства».

### «Крывавы» снег з'явіўся ў Антарктыдзе



Зямлю вакол украінскай навуковай станцыі ў Антарктыдзе пакрыў «крывавы» снег. Такім чынам яго афарбавалі мікраскапічныя водарасці. Крывавы колер хламідаманада снежная набывае з-за пігмента каратыну, патлумачыў дырэктар Нацыянальнага антарктычнага навуковага цэнтра Украіны Яўген Дзікі. Навукоўцы кажуць, што снег такога колеру спрыяе глабальнаму пацяпленню, паколькі менш адлюстроўвае сонечнае святло і хутчэй растае. Як следства — у імі утвараецца яшчэ больш ярка-чырвоных водарасцяў. Бліжэй да антарктычнай зімы, з прыходам халадоў, цвіценне спыняецца.

Віншуем!

**Наша фотакарэспандэнт увайшла ў шорт-ліст World Press Photo**

# «ПАРТРЭТЫ», ВАРТЫЯ ПЕРАМОГІ

**Упершыню сярод фіналістаў самай прэстыжнай у свеце міжнароднай прэміі фотажурналістыкі World Press Photo аказалася беларускі фатограф, фотакарэспандэнт газеты «Звязда» Таццяна ТКАЧОВА. Яе работы ў намінацыі «Партрэты».**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Выношвала ідэю праекта шмат гадоў, шукала герояў, пісала тэкст, рабіла фота, — гаворыць Таццяна. — Праекту дала назву «Паміж правам і сорамам». У ім расказваю пра жанчын, якія калісьці вырашыліся на аборт. Хацела адзначыць, што не агітую жанчын рабіць аборты ці не рабіць. Праект гаворыць пра тое, што такі досвед — частка нашага жыцця, і вельмі важна разумець гэта, перш чым даваць яму ацэнку. У апісанні праекта я расказала, як даведалася, што мая мама пасля Чарнобыля зрабіла аборт, і што разумею, як гэты вопыт траўміруе жанчын.

На прэмію падалі свае работы амаль чатыры з паловай тысячы фатографаў са 125 краін свету. У ходзе адбору фіналістаў члены журы World Press Photo прагледзелі 74 тысячы здымкаў і назвалі імёны 44 пераможцаў. Яны будуць абвешчаны 16 сакавіка падчас гала-канцэрта ў Амстэрдаме. Пераможцы намінацый «Фотаздымкі года» і «Фотарэпартаж года» атрымаюць 10 000 еўра.

Пасля конкурсу з фатаграфій пераможцаў збіраюць выстаўку, якую могуць наведваць людзі розных краін свету. Штогод на некалькіх мовах публікуецца кніга з усімі фотаздымкамі пераможцаў.

***Віншуем калегу з творчым поспехам і жадаем натхнення і новых дасягненняў!***

# ФЕРМЕРЫ ПРОСЯЦЬ ЗЯМЛІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Ён звярнуў увагу на тое, што ў Мінаблвыканкаме распрацоўваецца праграма развіцця вобласці на наступную пяцігодку. Яна мае на мэце павышэнне ўзроўню і якасці жыцця, стварэнне камфортнага асяроддзя, павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі за кошт эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў. І фермерскія гаспадаркі змогуць стаць адным з пунктаў росту. У вобласці ёсць не надта моцныя населеныя пункты, якім бы фермеры змаглі надаць другое дыханне.



## ІНВЕСТАРЫ Ў СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ

Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі маюць такую ж падтрымку, як і сельгасарганізацыі, у адпаведнасці з Рэспубліканскай праграмай на 2016—2020 гады. Па выніках конкурсаў Мінсельгасхарчу яны могуць разлічваць на фінансаванне са сродкаў рэспубліканскага бюджэту на першапачатковае ўладкаванне, у тым ліку меліярацыю зямель, будаўніцтва дарог, ліній электраперадачы, аб'ектаў водазабеспячэння, газіфікацыю. Па-за конкурсам у межах праграмы з рэспубліканскага бюджэту фінансуецца ўстанаўленне граніц зямельных участкаў і іншае. Ёсць і праблемы, але яны цалкам вырашальныя.

Ігар Пакуш, кіраўнік фермерскай гаспадаркі ў Маладзечанскім раёне, займаецца вытворчасцю агародніны. За пятнаццаць гадоў яго зямельны ўчастак павялічыўся з 15 да 1500 гектараў. Цяпер на пастаянняй аснове тут працуе 30 чалавек, а ў сезон — 600.

— Для фермерскіх гаспадарак закончыўся эксперымент, пачаты ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Яны перайшлі ў новую стадыю, занялі сваю нішу, займелі імя, брэнд. І цяпер дзяржава павінна падысці да іх развіцця больш паглыблена, бо фермерства — гэта адзін з фундаментаў, на якім павінна фарміравацца сельская гаспадарка ў вёсцы, што дапаможа замацаваць кадры на сяле. Я назіраю за жыццём і справамі суседніх фермераў і бачу, што ў многіх з іх дзеці засталіся жыць на роднай зямлі, адкрылі сваю справу. Не выключэнне і мой сын. Неабходна на дзяржаўным узроўні стварыць пэўныя ўмовы для замацавання ў сельскай мясцовасці не толькі сялян, але і настаўнікаў, урачоў, моладзі. А для гэтага трэба ўмацоўваць інфраструктуру сяла ў цэлым, — кажа Ігар Пакуш.

На яго думку, трэба, каб дзяржава звярнула ўвагу на фермераў як інвестараў у сельскую гаспадарку. Лічыцца, што перадаць вялікі маёмасны комплекс фермерскім гаспадаркам — гэта нармальна, а калі фермер просіць 20 гектараў зямлі, у якую ён укладзе дзесяць тысяч рублёў, то гэта лічыцца мала. «Фермераў варта разглядаць як інвестараў, якія гатовы ўкласці ў гэтую зямлю сваю працу, вопыт, нейкія фінансы, і не на адзін дзень, а на працяглы час. Неабходна таксама ўлічваць пры фарміраванні фермерскіх гаспадарак доўгатэрміновую перспектыву, каб бачыць, як іх зручней размясціць, якую спецыялізацыю яны выбіраюць. Акрамя таго, дазволіць на гэтых землях будаваць вытворчыя аб'екты, дамы, прадугледзець далейшую сувязь з насельніцтвам рэгіёна, гандлёвымі сеткамі», — кажа фермер.

— На сённяшні дзень практычна прыпынена выдзяленне зямлі для фермерскіх гаспадарак, — заклапочаны **старшыня Мінскай абласной асацыяцыі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак Мікалай СІЛІН.** — У раёне падпісалі дакументы, узгаднілі іх на выдзяленне зямлі. А кіраўнік сельгасарганізацыі адмаўляе: уся зямля пад пасевамі, пашай для жывёлы. Лічу, што гэтае пытанне неабходна замацаваць на заканадаўчым узроўні, а ў кожным раёне — стварыць камісію, якая займалася б канкрэтна выпадкамі адмовы. Мы дайшлі да пункта, калі не можам вырошчваць больш прадукцыі, а затраты тым часам растуць. Мы не патрабуем нейкую звышнатуральную зямлю, хоць з сярэднім балам. Сёння беларускую фермерскую бульбу ахвотна купляюць Украіна, Сербія, Македонія, Малдова і нават Польшча, якая калісьці забяспечвала Беларусь агароднінай. Вядома, бульба будзе запатрабавана, калі яна будзе якасная. А для гэтага неабходна нармальная зямля.

— У многіх фермераў прыклад бацькоў пераймаюць дзеці. Яны працуюць на зямлі, ствараюць сем'і. У мяне, напрыклад, сын пайшоў па маіх слядах. Прывядзіце прыклад, хто з кіраўнікоў калгасаў пакінуў у сябе сына? — звярнуўся да старшынь райвыканкамаў Мікалай Аляксандравіч. — Дык што нам сказаць дзецям, якія ўцягнулі ў фермерскую справу?

## ДЗЕ ПРАДАЦЬ? НА ЭКАЛАГІЧНЫМ РЫНКУ

Хвалюе фермераў і збыт прадукцыі. Яна запатрабаваная за мяжой. А на радзіме яе цяжка прадаць. У прыватнасці, у сеткавых крамах бульба каштуе 90 капеек за кілаграм. А фермеры прадаюць яе за межамі краіны па 35 капеек. Разам з тым з пастаўкамі ў супермаркеты ўзнікаюць праблемы. Вядома, фермеры ўдзельнічаюць у кірмашах, але яны праводзяцца не кожны дзень, ды і адводзяць ім нязручныя месцы. Чалавеку проста немагчыма пад'ехаць да машыны ўсутыч сваім транспартам — даводзіцца на плячах цягаць сеткі з агароднінай. Выказаліся прапановы, каб фермерам вызначылі пляцоўкі для продажу прадукцыі каля вялікіх аб'ектаў гандлю, дапамаглі пабудаваць узаемаадносіны з буйным гандлёвым бізнесам.

— Давайце вызначымся, каб у кожным раёне ў першым паўгоддзі прайшла сустрэча старшыні райвыканкама з фермерскай супольнасцю з удзелам камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні, камітэта эканомікі, з тым каб выслухаць кожнага, хто гатовы працаваць, і што можам ім прапанаваць. Наша задача, каб зямля давала эфектыўную аддачу, а людзі добра зараблялі, — звярнуўся да кіраўнікоў раёнаў старшыня Мінаблвыканкама. — Давайце без гэтых гульняў — даць, не даць. Не трэба, каб чалавек прыходзіў з працягнутай рукой. Вызначце, якая колькасць зямлі, у якіх сельскагаспадарчых арганізацыях, якая патрэба ў фермераў. Пры гэтым аддавайце яе тым фермерам, якія эфектыўна працуюць. Зямля павінна прыносіць максімальную аддачу.

Што датычыцца збыту прадукцыі, то Аляксандр Турчын прапанаваў як адзін з варыянтаў продаж на новым экалагічным рынку. Гэта будзе чатырохпавярховы комплекс плошчай 20 тысяч квадратных метраў. Яго будаўніцтва заканчваецца ў вёсцы Валяр'янава Мінскага раёна, і адкрыццё запланавана на першае паўгоддзе 2020-га. Тут прадугледжана вялікая адкрытая пляцоўка, дзе можна будзе прадаваць вырашчаны ўраджай адразу з машыны.

**Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі могуць разлічваць на фінансаванне са сродкаў рэспубліканскага бюджэту на першапачатковае ўладкаванне, у тым ліку меліярацыю зямель, будаўніцтва дарог, ліній электраперадачы, аб'ектаў водазабеспячэння, газіфікацыю.**

— Мы пачынаем заключаць папярэднія дагаворы з гаспадаркамі, якія гатовы на пастаяннай аснове рэалізоўваць там сваю прадукцыю. Цэны арэнды будуць камфортныя, — праінфармаваў губернатар.

Вядома, не ўсе фермеры могуць дазволіць сабе трымаць на рынку пастаяннага прадаўца. У гэтым выпадку разглядаецца альтэрнатыўны варыянт. Магчыма, нейкая кампанія будзе займацца купляй фермерскай прадукцыі і збываць яе на рынку.

Сярод агучаных праблем — высокія цэны на паліва і немагчымасць набываць яго па льготах. Яшчэ адна — немагчымасць застрахаваць ураджай, які залежыць ад умоў надвор'я. Здараюцца гады, калі вытворцы нясуць страты, а страхавыя кампаніі ў найлепшым выпадку толькі фіксуюць гэта. Аляксандр Турчын даручыў праверыць факты, і калі яны знойдуць пацвярджэнне, то Мінаблвыканкам падрыхтуе зварот, які будзе накіраваны ўраду.

А вось на думку **старшыні камітэта па развіцці прадпрымальніцтва ў аграрна-прамысловым комплексе Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Антона КАСЫНКІНА,** фермеры выстаўляюць неабгрунтаваныя мэты і патрабаванні. Яны не могуць выпрацаваць правільныя падыходы да свайго развіцця. Іх патрабаванні зводзяцца да выдзялення зямлі ў прыватную ўласнасць і пашырэння крыніц фінансавання. Дробныя фермеры раздроблены паміж сабой, таму што ў іх адсутнічае асабістая праграма развіцця.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


## О реализации имущества ОАО «МонолитГрад»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «Фрондера» (220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121, тел. +375 29 305 86 50 • e-mail: **info.torgi@orgtorg.by** • сайт **https://orgtorg.by**) |
| **Продавец** | ОАО «МонолитГрад» (220037, Минск, ул. Долгобродская, д. 16А, комн. 11) в лице управляющего – ООО «ЛибертиЛекс» (220113, Минск, ул. Мележа д. 1, оф. 1118-28, тел.: +375 17 395 89 17, +375 29 310 90 85) |
| **Дата, время, место и форма проведения торгов** | **Аукцион состоится 13.03.2020 в 12.00** (регистрация участников с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.<br>В отношении Лота № 1 проводятся седьмые повторные торги; в отношении Лота № 2 проводятся вторые повторные торги |
| **Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним** | **Лот № 1** предприятие как имущественный комплекс ОАО «МонолитГрад» – «Производственная база в г. Костюковичи» (местонахождение: Могилевская обл., г. Костюковичи, участок № 1, № 2):<br>1) капитальное строение – здание склада-навеса, площадь 2 867 кв. м (свидетельство 732/224-669, инвентарный номер 732/С-5785);<br>2) капитальное строение – здание главного производственного корпуса, площадь 7 310 кв. м (свидетельство 732/224-670, инвентарный номер 732/С-5786);<br>3) капитальное строение здание арматурного цеха, площадь 1 711 кв. м (свидетельство 732/224-671, инвентарный номер 732/С-5787) |
| | **Лот № 2** пусковой комплекс 5.2 в многоэтажном жилом доме № 2 по генплану в квартале ул. Янковского – Горецкого (незавершенное незаконсервированное капитальное строение) (местонахождение: г. Минск, ул. Янковского, д. 34) |
| | Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Чеслав, тел. 8 (029) 275 60 59.<br>Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида) |
| **Начальная цена предмета торгов** | Лот № 1 – 109 500,00 бел. руб. без НДС (п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ);<br>Лот № 2 – 329 250,00 бел. руб. без НДС (п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ); |
| **Шаг торгов** | Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета аукциона. Сумма шага аукциона: Лот № 1 – 5475,00 бел. руб., Лот № 2 – 16 462,50 бел. руб. |
| **Порядок проведения торгов** | Победителем аукциона признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других участников. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявка на участие в них подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 % |
| **Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка** | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % (Лот № 1 – 10950,00 бел. руб., Лот № 2 – 32 925,00 бел. руб.) от начальной цены предмета аукциона.<br>Для участия в торгах необходимо перечислить сумму задатка на р/с **BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «МонолитГрад» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.».<br>Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. **Окончание приема заявлений в 16.00 12.03.2020 г.**<br>Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.<br>Государственная регистрация договора купли-продажи, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.<br>Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info/** |
| **Возмещение затрат** | Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.<br>На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.<br>Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов |
| **Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов** | Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона |
| **Срок оплаты предмета торгов** | Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона |
| **Ранее опубликованные объявления** | По Лоту № 1 в газете «Звязда» № 96 от 22.05.2019 г., № 117 от 25.06.2019 г., № 138 от 25.07.2019 г., № 157 от 21.08.2019 г., № 182 от 25.09.2019 г., № 202 от 23.10.2019 г., № 227 от 29.11.2019 г., № 246 от 28.12.2019 г. Журнал «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие». – 2019. № 12 – стр. 59–60, № 11 – стр. 66–67, № 10. – стр. 55, № 9 – стр. 63–64, № 8 – стр. 58–59, № 7 – стр. 68–69, № 5 – стр. 66–67.<br>по Лоту № 2 в газете «Звязда» № 218 от 16.11.2019 г., № 246 от 28.12.2019 г. |
| **Дополнительная информация** | Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.<br>Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» |

УНП 100100799



## ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ООО «КИППЕР ФИШ», опубликованном в газете «Звязда» от 22.02.2020, вносятся следующие изменения:

1. Рег. знак лота № 2 читать как **АК4282-1**.
2. Дата начала электронных торгов изменена на **30.03.2020**. Дата окончания торгов изменена на **30.03.2020**.
3. Дата окончания приема заявок изменена на **27.03.2020**

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

УНП 191224638

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

27 ЛЮТАГА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15881)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# IRDORATH: «Мы — флагманы беларускай культуры ў Еўропе»

**На беларускай музычнай прасторы гурт Irdorath — прыклад гісторыі, калі талент сам прабівае сабе месца пад сонцам. Уладзімір (рэжысёр народных абрадаў і свят з залатымі рукамі) пазнаёміўся з Надзеяй (без пяці хвілін юрыстам), а далей — класіка жанру: паверылі ў сваю мару, знайшлі аднадумцаў і працавалі кожны дзень дзеля здзяйснення задуманага. Як вынік — тры альбомы ў стылі фолк-фэнтэзі, пяць кліпаў і гастрольны графік па свеце кожны год. Якраз перад чарговым ад'ездам мы сустрэліся з музыкантамі, каб пагаварыць пра свабоду самавыяўлення, любоў да беларускага і сям'ю.**

***— У апошнім кліпе закранаеце шмат важных тэм, сярод якіх сям'я, спроба разабрацца ў сабе і, адпусціўшы мінулае, здабыць свабоду. Узнікненне песні абумоўлена ўласнымі перажываннямі?***

**Надзея:** — Так, тут вельмі асабісты кантэкст. Калі звярнуцца першапачаткова да тэксту, то ў ім апісваецца ўсё, што адлюстроўвае наша жыццё. Там схавана мая гісторыя... Адна частка згублена ў дарозе — гэта наша пастаяннае намотванне кіламетраў па свеце. Самая шчаслівая — пакінута ў краі далёкім, дзе нам было добра. І так я з дапамогай іншасказальнай мовы Irdorath апавядаю гісторыю маіх перажыванняў у канкрэтны час. Але, думаю, такі сюжэт блізкі кожнаму чалавеку, бо наўрад ці знойдзецца той, чыё сэрца ніколі не пакутавала і не разбівалася.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Абітурыент-2020

# ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ: ДА ЧАГО РЫХТАВАЦЦА?

## Зроблены першы крок да аб'яднання экзаменаў

**Выпускны экзамен у школе могуць сумясціць з цэнтралізаваным тэсціраваннем. Праўда, для гэтага спатрэбіцца пэўны час — прыкладна два-тры гады. Такія планы анансаваў на выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

**На яго думку, сумяшчэнне выпускных экзаменаў з ЦТ дазволіць зменшыць нагрузку на выпускнікоў. «Вынікі праведзенага незалежнага даследавання паказваюць, што большасць апытаных бацькоў, настаўнікаў і саміх вучняў падтрымліваюць сумяшчэнне з тэсціраваннем выпускных экзаменаў па мовах і матэматыцы і нават увядзенне для ўсіх навучэнцаў профільных класаў выпускнога экзамену па замежнай мове», — паведаміў ён.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Стратэгія ў рэальным часе

# АСВОІЦЬ ПРАСТОРУ

## Як і навошта гэта робяць кіберспартсмены

**У XXI стагоддзі складана знайсці тых, хто б ніколі не цікавіўся камп'ютарнымі гульнямі. Экшн, квэсты, лагічныя — кожны можа выбраць сабе любую па душы і атрымліваць задавальненне ад працэсу. А вось каб яшчэ і грошы — гэта мара мільёнаў... Ажыццявіць яе змаглі кіберспартсмены. Прынамсі, так лічаць многія. Мы пабывалі на адным з турніраў і высветлілі ў дырэктара па камунікацыях Беларускай федэрацыі кіберспорту Ягора МАЛЫЖЭНКАВА ўсе тонкасці і сакрэты існавання названага кірунку ў нашай краіне.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

### СПОРТ АБО БІЗНЕС

— Мы гаворым пра камандныя або індывідуальныя спаборніцтвы, у аснове якіх ляжаць камп'ютарныя гульні. Але на сённяшні дзень у кіберспорце, нават у сусветным, бізнесу практычна няма. Цяпер ён развіваецца як спорт у класічным разуменні. Прысутнічаюць спаборніцкія моманты, ёсць балельшчыкі, фанаты, якія любяць сачыць за працэсам. Названыя аспекты спрабуюць актыўна выкарыстоўваць розныя брэнды ў сваіх камерцыйных інтарэсах, і гэта добра для спорту, — кажа Ягор. — Але пакуль у гэтым пытанні наша краіна знаходзіцца на пачатковым этапе. Беларускі рынак вельмі вузкі і маленькі, пакуль тут больш фанацтва і энтузіязму. Зарабляюць тыя гульцы, якія выйшлі на прафесійны ўзровень. А астатнія могуць атрымаць нейкія грошы, толькі выйграўшы ў турнір.

Як лічыць суразмоўнік, нам трэба раўняцца на такія краіны, як Японія, Карэя, ЗША і г. д. Цяпер Кітай, напрыклад, проста імклівымі тэмпамі бяжыць наперад, арганізуе шмат турніраў, у тым ліку і для паўпрафесійных камандаў.

— Кожны год у краіне з'яўляецца па некалькі школ для кіберспартсменаў, але пакуль яшчэ ні адзін праект больш за названы тэрмін не пражыў, бо першапачаткова тыя ствараюцца як бізнес з боку заснавальнікаў: прыйсці, напампаваць людзей нейкімі ведамі, каб яны заплацілі. Ды і той тэорыі, якая там даецца, для таго, каб стаць кіберспартсменамі, мала, — кажа Ягор.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 02 2020 г.

Думай галавой

## «БЫЦЬ МЕДЫЯПІСЬМЕННЫМ — ПРОСТА!»

### Падлеткаў запрашаюць да ўдзелу ў конкурсе «Лаві фэйк»

Вось што вы будзеце рабіць, калі даведаецеся з інтэрнэту, што сёння ў 19.00 канец свету? Пабяжыце ў краму запасацца «дашыракам», сухарамі і вадой? А, можа быць, схаваецеся ў склеп? Кароткаметражны фільм «Канец свету», які зняў васьмікласнік Варапаеўскай сярэдняй школы Пастаўскага раёна Іван Заруба, перамог летась у конкурсе «Лаві фэйк».




У ліку пераможцаў аказаўся таксама Максім Юдзянкоў з Усходаўскай сярэдняй школы Магілёўскага раёна, які больш як год «паляваў» у інтэрнэце на інфармацыйных «качак»: пералапаціў некалькі сотняў паведамленняў, пераправяраў, параўноўваў, вылічваў...

А ў намінацыі «Графічныя і інтэрактыўныя медыя» перамагалі навучэнцы сярэдняй школы № 20 з Оршы, стварыўшы ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» групу «Вашы фэйкі ў нашых руках». Іх банк увесь час папаўняецца новымі прыкладамі — хітрыкамі маркетолагаў, рэкламадаўцаў, лістамі і рассылкамі па электроннай пошце, якія ўтрымліваюць мноства прывабных прапаноў, памылак, знойдзеных у вучэбных дапаможніках і так званых «рашэбніках».

Цікава, хто стане пераможцам новага медыадукацыйнага конкурсу «Лаві фэйк», старт якому дало Таварыства беларускай школы?

«Ты вучань 8—11 класа? Ты бачыш, што людзі каля цябе вераць тэлевізару, паддаюцца на маніпуляцыі ў сацыяльных сетках, а можа, праз інтэрнэт некага цкуюць? Ты ведаеш, як ім дапамагчы? Тады гэты конкурс для цябе! Твой медыяпраект, магчыма, дапаможа тым, хто некрытычна ўспрымае ўсё, што кажуць з экрана, не правярае надзейнасць крыніц інфармацыі, не ўмее адрозніць факты ад меркаванняў, не ведае спосабаў маніпуляцыі з боку СМІ, трапляе пад уплыў рэкламных хітрыкаў, не разумее, што трэба абараняць свае персанальныя дадзеныя, не можа даць рады інтэрнэт-тролям ці тым, хто ў сацыяльных сетках здзекуецца з іншых...»

Таварыства беларускай школы прапануе падлеткам выпрабаваць сілы ў ролі медыямейкера і мэдыяэксперта і выказаць сваё меркаванне ў любым медыйным жанры на тэму «Быць медыяпісьменным — гэта проста!».

### Конкурс прадугледжвае наступныя намінацыі:

1. Мультымедыя — аўдыё ці відэа: кліп, міні-фільм (не даўжэйшы за сем хвілін), анімацыя, серыя сторыз, навучальны відэаролік, падкаст, тэле- ці радыёперадача для школьнага тэлебачання і г. д.
2. Графічныя медыя: інфаграфіка, фота і фотарэпартаж, плакат, комікс, і г. д.
3. Тэкставыя медыя: лонгрыд, блог, пост (група ці старонка) у сацыяльнай сетцы, артыкул у школьнай прэсе, журналісцкае расследаванне, рэпартаж і г. д.
4. Інтэрактыўныя медыя: гульня, квіз і г. д.

Прыняць удзел у конкурсе вельмі проста. Падумай, якія, на твой погляд, ёсць праблемы ў карыстанні прадукцыяй масмедыя і прапануй, як можна адну з іх вырашыць. Выберы медыйны жанр і намінацыю, якія найбольш адпавядаюць пастаўленай задачы і тваім уменням стваральніка. Але памятай, што інфармацыя для бабулі і сябра павінна быць пададзена па-рознаму.

Пры стварэнні медыяпраекта трэба прытрымлівацца журналісцкай этыкі і стандартаў, паважаць аўтарскія правы. Дасласць праект ці спасылку на яго неабходна на адрас **mediakonkurs2020@gmail.com** са сваім прозвішчам у тэме ліста і намінацыяй (напрыклад: Саша Кавалевіч_ Мультымедыя).

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца падлеткі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Работы прымаюцца да 15 красавіка. **Пажадана выканаць іх на беларускай мове.** Ацэньваць праекты і вызначаць пераможцаў будзе прафесійнае журы. Цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў адбудзецца ў маі ў Мінску.

# ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ: ДА ЧАГО РЫХТАВАЦЦА?

### ЧАМУ НЕ КАРЭЛЮЮЦЬ АДЗНАКІ

Новыя падыходы да выніковай атэстацыі навучэнцаў агучыла ў сваім выступленні на калегіі **дырэктар сталічнай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны Наталля БУШНАЯ:**

— Кожны педагог усведамляе, што змены павінны адбыцца, хоць абсалютна зразумела, што да іх трэба сур'ёзна і ўзважана рыхтавацца: правядзенне сумешчаных экзаменаў — справа няпростая. Сёння цэнтралізаванае тэсціраванне, фармат яго правядзення, змест заданняў усімі намі ўспрымаюцца як трывалая традыцыя. Змест тэстаў не выходзіць за межы школьнай праграмы. Як настаўнік матэматыкі, які працуе ў выпускным класе, кажу пра гэта з поўнай адказнасцю. Разам з тым варта адзначыць, што падыходы да выніковай атэстацыі выпускных класаў, насуперак запатрабаванай часам дынамічнасці ўсіх працэсаў, заставаліся нязменныя ўжо дастаткова доўга. У сувязі з гэтым узнікае цалкам заканамернае пытанне: а ці трэба змяняць тую сістэму, якая ўжо склалася і зразумелая ўсім педагогам?

Практыка паказвае, што трэба. Спашлюся на вопыт правядзення выніковай атэстацыі навучэнцаў на прыкладзе прадмета, які мне бліжэйшы за ўсё. Экзаменацыйная работа па матэматыцы за курс сярэдняй школы ўключае ў сябе дзесяць заданняў і доўжыцца пяць гадзін. Тэст па матэматыцы — 32 заданні, з якімі трэба справіцца за тры гадзіны. Пры гэтым школьны экзамен праводзіцца па адкрытых тэкстах, даступных для навучэнцаў да пачатку экзамену, а канкрэтны змест заданняў ЦТ абітурыент бачыць толькі непасрэдна падчас іспыту. Таму чакаць адэкватнай карэляцыі адзнак у школе і на ЦТ аб'ектыўна не выпадае.

Яшчэ адзін прыклад. **Па рускай або беларускай мове за курс базавай школы навучэнцы пішуць дыктоўку, за курс сярэдняй школы — пераказ, а пры паступленні — тэст. Зусім розныя формы, якія патрабуюць розных метадаў падрыхтоўкі і абапіраюцца на розныя сістэмы ацэньвання вынікаў вучэбнай дзейнасці.**

Вядома, можна казаць пра рознабаковае развіццё навучэнцаў. Але той факт, што гэта прыводзіць да іх перагрузкі, не выклікае сумненняў. Таму сёння мы назіраем пэўную супярэчнасць паміж існуючай сістэмай выніковай атэстацыі і неабходнасцю знізіць вучэбную нагрузку на навучэнцаў, захаваўшы і нават памножыўшы якасць іх ведаў. Каб атрымаць новы імпульс для далейшага развіцця, гэтую супярэчнасць трэба будзе нашай сістэме адукацыі вырашыць. Адзіныя зразумелыя патрабаванні да выніковай атэстацыі, лічу, знімуць пэўнае непаразуменне ў ацэнцы вучэбных дасягненняў навучэнцаў і з боку бацькоў вучняў.

### САМЫЯ КАШТОЎНЫЯ МЕТРЫ

Між іншым, ужо летась сістэма ЦТ зведала значныя змены, у прыватнасці змянілася сістэма падліку балаў, налічаных за выкананне тэсту. Арганізатары ЦТ запэўніваюць, што **іх мэта — укараненне методыкі, якая б не ранжыравала абітурыентаў, а давала ацэнку ведаў у абсалютнай велічыні, гэта значыць, стала б больш аб'ектыўная.** Ранейшая рэйтынгавая методыка адвочна не дазваляла супаставіць узровень ведаў, прадэманстраваных абітурыентам на ЦТ, з яго школьнымі ведамі. Да таго ж новая методыка ліквідуе псіхалагічны бар'ер, які ўзнікаў у абітурыентаў пасля атрымання нізкіх балаў. Напрыклад, 10 балаў на ЦТ — гэта не рэальны ўзровень ведаў абітурыента, а яго рэйтынгавая ацэнка за выкананне канкрэтнага тэста, — так тлумачылі прадстаўнікі РІКВ новаўвядзенне, адказваючы на крытыку, што абрынулася на іх пасля здачы абітурыентамі рэпэтыцыйнага тэсціравання.




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Між іншым, адмаўленне ад рэйтынгавай шкалы адразу адбілася на балах, якія абітурыенты атрымалі: высветлілася, што **пераадолець 50-бальную планку — цяпер не праблема. А вось набраць больш за 75 балаў па-ранейшаму складана.** А пасля здачы ЦТ і атрымання сертыфікатаў пытанняў у абітурыентаў і педагогаў стала яшчэ больш.

— Ёсць меркаванне, што новая методыка недаацэньвае добра падрыхтаваных абітурыентаў. Лічу гэта меркаванне некарэктным, — канстатаваў вынікі ЦТ 2019 года **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — Пасля 70—75 балаў, што ранейшая, што новая методыка дае аднолькавы вынік. Тыя, хто паказаў лепшыя веды, будуць мець і вышэйшыя балы. Шкала падліку балаў не з'яўляецца лінейнай. Можна трактаваць гэта з пункту гледжання спорту: апошнія метры перад фінішам самыя каштоўныя. І сумненняў у эфектыўнасці і аб'ектыўнасці новай сістэмы падліку балаў не павінна быць ні ў абітурыентаў, ні ў іх бацькоў, настаўнікаў або рэпетытараў.

— Новая методыка была ўведзеная не для штучнай дэманстрацыі росту добрых адзнак, а для настаўніка, каб ён мог працаваць над якасцю адукацыі. Цяпер кожны педкалектыў можа параўнаць, якая была ў абітурыента адзнака ў школе і які вынік ён паказаў на ЦТ, і пры несупадзенні, напэўна, задумаецца: чаму такое адбылося? — падкрэслівае Ігар Карпенка. — Новая методыка закранула і інстытут рэпэтытарства. Адукацыя — не сфера паслуг! Не рэпэтытары, а школа павінна даваць навучэнцу веды, прадугледжаныя вучэбнай праграмай, якія будуць неабходныя яму ў жыцці. Без розных камерцыйных структур і даплат.

### СТАЦЬ СТУДЭНТАМ УСЁ ПРАСЦЕЙ

Паколькі сітуацыя ў вобласці нізкіх і сярэдніх балаў пасля пераходу на новую сістэму падліку балаў сур'ёзна змянілася, усе чакалі, што парахадныя парогі, але гэтага не адбылося. Шчыра кажучы, і раней парогавыя значэнні ў 10-15 балаў, а тым больш у сем балаў па стабальнай шкале выклікалі ў педагогаў горкую ўсмешку. А калі цяпер балы на ЦТ можна супаставіць са школьнымі адзнакамі, атрымліваецца ўвогуле вельмі сумная сітуацыя. Дастаткова рашыць літаральна два-тры заданні з тэста, і ты ўжо можаш прэтэндаваць на запаветны студэнцкі білет.

— Па нашых дакументах, тэрмін дзеяння сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання складае два гады, — удакладніў Юрый Міксюк. — І ў абітурыентаў ёсць права не здаваць ЦТ, а скарыстацца леташнімі сертыфікатамі. У выпадку калі б мы перагледзелі мінімальныя парогі ў бок павышэння, хтосьці мог бы апынуцца за бортам прыёмнай кампаніі.

Ён паабяцаў, што налета мінімальныя парогі павысяцца, але гэта будзе зроблена пасля аналізу вынікаў абітурыентаў 2019 года. Дык ці павысяцца прахадныя парогі для маладых людзей, якія будуць штурмаваць ВНУ ў 2020 годзе, або ўсё застанецца па-ранейшаму?

Падчас круглага стала, які прайшоў нядаўна ў БелТА, **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ** паведаміў, што змяненне парогавых значэнняў балаў ЦТ зноў не плануецца.

— Першы варыянт, вынесены на абмеркаванне і разгляд, — пакінуць парогавыя значэнні на ўзроўні мінулага года, другі — павялічыць іх, трэці — зусім ануляваць. Пры гэтым ануляванне парогавых значэнняў ні ў якім разе не варта расцэньваць як адкрыты ўваход у сістэму вышэйшай адукацыі. Яно прадугледжвае толькі тое, што выключна конкурсная сітуацыя будзе вызначаць тых, хто паступіць, — растлумачыў Сяргей Каспяровіч. — У выніку з улікам тых рызык і пазітыўных момантаў, якія прысутнічаюць падчас рэалізацыі кожнага з гэтых варыянтаў, **было прынята папярэдняе рашэнне аб захаванні парогавых значэнняў на ўзроўні мінулага года.**

«Пытанні прыёму закранаюць вялікую колькасць грамадзян. Таму любое дзеянне павінна быць асэнсавана і сур'ёзна ўзважана. Такая аргументацыя якраз і лягла ў аснову таго, што на бягучы момант мы схіляемся да захавання парогавага значэння на ўзроўні мінулага года», — падкрэсліў начальнік галоўнага ўпраўлення.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

У ліку найлепшых

# «Медык» даў галоўнае — прафесійны досвед»

**Падчас леташняга Усебеларускага з'езда студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Рамантыка» традыцыйна адзначылі найлепшыя студэнцкія атрады краіны. Першым сярод медыцынскіх па выніках трэцяга працоўнага семестра стаў «Медык» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Атрад адметны яшчэ і тым, што і яго камандзір, і яго камісар таксама вызначыліся ў адпаведных намінацыях як самыя ініцыятыўныя і працавітыя. З байцамі мы і пагутарылі аб атрыманым вопыце.**


Байцы студатрада «Медык».

Дваццацігадовая Кацярына ЖУК — камандзір «Медыка» — не хавае пачуццяў: для дзяўчыны такі досвед аказаўся добрай магчымасцю папрактыкавацца ў прафесійнай сферы, а таксама зарабіць.



— Зараз вучуся ўжо на чацвёртым курсе педыятрычнага факультэта ГДМУ. Дазналася аб студатрадаўскім руху ва ўніверсітэце, калі іншыя расказвалі пра свой вопыт удзелу ў ім. Мяне гэта вельмі зацікавіла. Адразу ведала, што хачу быць камандзірам атрада, бо я вельмі актыўная і камунікабельная. У нас нават была магчымасць выбраць аддзяленне, дзе хочам працаваць. Я спынілася на аддзяленні радыялогіі, — расказвае Каця.

Працоўны семестр студэнтаў-медыкаў праходзіў у Гродненскай універсітэцкай клініцы і доўжыўся амаль паўтара месяца. Аднак, як заўважыла Кацярына, некаторыя заставаліся працаваць там і надалей па кантракту.

— Хто вучыўся на першым ці другім курсе, маглі быць санітарамі, хто на апошніх — медсёстрамі. Рабочы дзень пачынаўся а восьмай гадзіне раніцы і заканчваўся ў восем гадзін вечара. Мне трэба было сачыць за назначэннямі для пацыентаў, дапамагаць іншым санітарам па сталоўцы, разносіць таблеткі, выпісваць накіраванні на аналізы, рабіць уколы і іншае. Нялёгка было толькі ў першыя дні, напружанне сыходзіла па меры таго, як адпрацоўваліся навыкі. У нашай камандзе не было тых, хто хацеў спыніцца. Усе імкнуліся дапамагчы пацыентам, бо менавіта з гэтым звязана наша будучая прафесія, — кажа дзяўчына.

Суразмоўніца паведаміла, што дзейнасць у рамках студатрада ніяк не перашкаджае вучобе, таму выкладчыкі добра ставяцца да такой ініцыятывы студэнтаў.

— Галоўнай матывацыяй для мяне з'яўлялася атрыманне карыснага вопыту. Ва ўніверсітэце ў большасці навучанне мае тэарэтычны кірунак, таму вельмі хацелася паспрабаваць свае сілы на практыцы. Ды і лета правесці актыўна, адчуць, як гэта — быць незалежнай ад бацькоўскіх грошай. Дзякуючы працы ў студатрадзе зразумела, што работа з дзецьмі мне нашмат бліжэйшая, чым з дарослымі. Гэтым летам хачу зноў сюды пайсці, — падсумоўвае Каця.

Васямнаццацігадовы студэнт лячэбнага факультэта ГДМУ Ягор ЛЯНКЕВІЧ лічыць, што



праца ў студатрадзе — добрая адаптацыя да дарослага жыцця. З першага курса хлопец актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю, удзельнічае ў розных рэспубліканскіх конкурсах, таму не дзіўна, што і падчас працоўнага семестра ў «Медыку» ўжо на другім курсе ён абраў кіраўнічую пасаду — камісара.

— Я з'яўляюся часткай калектыву рэанімацыйнага аддзялення клінікі, быў санітарам. Усё было ў навінку, мяне можна было параўнаць з цяплічнай кветкай, якую выставілі на вуліцу і якой трэба было неяк выжыць. Вядома, што праца медперсаналу — няпростая, трэба мець вытрымку, каб спраўляцца з нагрузкай і стрэсам, кожны дзень магчымыя неардынарныя сітуацыі. Змены доўжыліся па 12, а то і па 24 гадзіны. Штодзень я правяраў на тэлефоне статыстыку колькасці крокаў, якія прайшоў за рабочы дзень, — ён паказваў 15—20 кіламетраў. Таму можна сказаць, што быў «на адрэналіне», якім і зараджаўся кожную хвіліну. Увогуле лічу, што атрымаў вялікі вопыт, як мінімум назіраючы за работай урачоў. А таксама зарабіў грошы, на якія пасля з'ездзіў на адпачынак у Львоў.

Падчас працоўнага семестра Ягор адказваў за культурныя мерапрыемствы: злёты, пікнікі, спартыўныя гульні, экскурсіі.

— Мы ладзілі для сябе розныя актыўнасці. Спявалі песні пад гітару, адзначалі святы, а аднойчы нават заказалі паром, дзе добра адпачылі. Дагэтуль з камандай са студатрада пастаянна на сувязі: тэлефануем адно аднаму, сустракаемся.

Дзевятнаццацігадовая Юлія ШЭЎКА, якая вучыцца на трэцім курсе лячэбнага факультэта ГДМУ, даведалася аб магчымасці працаўладкавання ў студатрадзе ад знаёмага, што таксама вучыцца ў гэтай ВНУ. І хутка зразумела — вось тое, што патрэбна!



— Я шукала першую ў жыцці падпрацоўку на лета. Пасля другога курса ва ўніверсітэце ў нас не было практыкі, таму вельмі хацелася, каб падпрацоўка была звязана менавіта з медыцынай. Абрала ўралагічнае аддзяленне, ужо з першых дзён мяне ўзялі пад нагляд больш дасведчаныя санітары. Пацыентам я спадабалася, гэта прыемна здзівіла. Пасля заканчэння працоўнага семестра перавялася на кантракт у гэтую клініку, працавала да студзеня, ну а пасля пачаліся сесіі.

У планах Юлі — не спыняцца, надалей удзельнічаць у студатрадаўскім руху.

— Памятаю, бацькі казалі: можа, ты лепш прыедзеш дадому і атрымаеш гэтыя грошы ад нас? Але для мяне справа не ў заробку, а ў жаданні развівацца, не сядзець склаўшы рукі. Лічу, што тыя, хто прайшоў праз студатрады, маюць вялікую перавагу перад іншымі студэнтамі: цяпер мне лягчэй праводзіць розныя медыцынскія маніпуляцыі і камунікаваць з людзьмі. Дзякуючы «Медыку» мы з камандай наведвалі розныя гарады краіны, сустракаліся адно з адным на выязных мерапрыемствах. Таксама знаёміліся са студэнтамі з іншых атрадаў. Дарэчы, так сустрэла свайго цяперашняга хлопца. Можна сказаць, што БРСМ збліжае сэрцы!

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Перазагрузка

## У студатрадзе — круглы год

**Прэзідэнт падпісаў Указ № 58 аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў.**

Дакументам замацаваны шэраг новых нормаў, якія дазволяць сістэматызаваць працэдуру іх фарміравання, павысяць эфектыўнасць дзейнасці, узмоцняць арганізацыйную і метадычную падтрымку студатрадаўскага руху з боку зацікаўленых органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

У прыватнасці, ва ўказе канкрэтызавана паняцце «студэнцкі атрад», вызначаецца ўзрост маладых грамадзян, якія могуць весці працоўную дзейнасць у іх складзе, — ад 14 да 31 года. Замацоўваецца магчымасць сумяшчаць навучальную і вытворчую практыку з работай у студэнцкім атрадзе пры ўмове яе адпаведнасці спецыяльнасці навучэнца, напрыклад інжынера-будаўніка. Іншымі словамі, дзейнасць у складзе атрада для шэрагу байцоў можа быць залічана як навучальная ці вытворчая практыка. Студэнцкім атрадам таксама даецца права весці дзейнасць круглы год, калі яна не перашкаджае адукацыйнаму працэсу.

Акрамя таго, указам прадугледжваецца надзяленне ЦК ГА «БРСМ» правам наступнага размеркавання паміж накіроўваючымі арганізацыямі сродкаў, якія паступілі на яго разліковы рахунак у выніку вызвалення прымаючых студэнцкія атрады арганізацый ад выплаты абавязковых страхавых узносаў (пенсійнае страхаванне). Раней у Саюза моладзі ўзнікалі цяжкасці з фінансаваннем накіраваных на развіццё дзейнасці студэнцкіх атрадаў мерапрыемстваў, што ладзіліся на раённым ці абласным узроўні. Цяпер БРСМ зможа пераводзіць грошы і на іх, падтрымліваючы гэты рух нават на ўзроўні пярвічных арганізацый.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Новыя старты

## З «Уладароў вёскі» — у «Пачынаючага фермера»

**БРСМ прапануе вясковай моладзі ўзяць удзел у бізнес-праекце з такой назвай, які мае намер запусціць сёлета.**

Па задуме, інтэлектуальная бізнес-гульня аб'яднае школьнікаў, якія жывуць у вёсцы, студэнтаў устаноў адукацыі сельскагаспадарчага профілю, маладых спецыялістаў аграрнага сектара, а таксама прадпрымальнікаў сферы АПК. Яна будзе спрыяць развіццю ў сельскай моладзі навыкаў бізнес-планавання, выпрацоўцы кіраўніцкіх рашэнняў і ўмення працаваць у камандзе.

Гульня была прапанавана Расійскім саюзам сельскай моладзі (РССМ) на палях Міжнароднага кангрэса сельскай моладзі. Мерапрыемства нядаўна праходзіла ў Казані (Татарстан) і стала камунікацыйнай пляцоўкай, якая дазволіла БРСМ прэзентаваць на міжнароднай арэне практыкі работы з моладдзю аграпрамысловага комплексу.

БРСМ і РССМ падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве яшчэ ў 2018 годзе. Увесь гэты час узаемадзейнічалі, вывучалі праекты абедзвюх арганізацый для сельскай моладзі, аказвалі адно аднаму метадычную дапамогу.

На Міжнародным кангрэсе сельскай моладзі фактычна адбыўся абмен праектамі. Сёлета бізнес-гульню «Пачынаючы фермер» апрабуюць на абласным узроўні, плануецца правесці і рэспубліканскі фінал.

У сваю чаргу Расійскі саюз сельскай моладзі зацікавіўся нашым сямейным сельскагаспадарчым праектам «Уладар вёскі» і плануе ў 2020 годзе ўпершыню правесці яго ў сваёй краіне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Класныя навіны

## Куды прывёў «Вожык у тумане»?

**У гімназіі № 10 Маладзечна адкрыўся адукацыйны STEAM-цэнтр. Гэта стала магчыма дзякуючы кампаніі «Апалон Аппс», якая займаецца распрацоўкай мабільных праграм і з'яўляецца рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій. Падтрымку аказалі таксама асацыяцыя «Адукацыя для будучыні» і ўпраўленне па адукацыі райвыканкама.**

— Перадгісторыя падзеі наступная. З лістапада да снежня 2018 года гімназія ўдзельнічала ў рэспубліканскім конкурсе для ўстаноў адукацыі «Хачу вучыцца ў «STEAM-класе». На другім яго этапе былі адзначаны дванаццаць найлепшых праектаў. Мы з праектам «Вожык у тумане» занялі 11-е месца і былі ўключаны ў рэзерв на адкрыццё цэнтра. Для яго арганізацыі было закуплена неабходнае абсталяванне: ноўтбукі апошняга пакалення, базавыя і рэсурсныя наборы па робататэхніцы LEGO, тэлевізар, відэакамера, мікрафон, графічны планшэт. Усё гэта дазволіць навучэнцам пад кіраўніцтвам спецыяльна падрыхтаваных педагогаў займацца па асноўных STEAM-кірунках, — расказала **дырэктар гімназіі Таццяна КАМКОВА.**

Адукацыйныя паслугі для навучэнцаў будуць арганізаваны на бясплатнай аснове ў форме факультатыўных заняткаў, аб'яднанняў па інтарэсах у пазакласны час, а таксама ў рамках шостага гімназічнага дня. Плануецца, што тут будуць вучыцца дзеці з устаноў адукацыі ўсяго раёна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*Ліга смеху*

# Шляхі-дарогі «Дзяцей Цьюрынга»

**Каманда БДУ «Дзеці Цьюрынга» выйшла ў чвэрцьфінал Вышэйшай лігі КВЗ. Інтрыга вырашылася падчас другой гульні 1/8 фіналу ў Маскве. Беларусы занялі першае месца, падзяліўшы яго з тытулаванай і вопытнай расійскай камандай «Руская дарога» Армавірскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта — яны набралі па 14,7 бала. Трэцюю пуцёўку ў чвэрцьфінал выйграла зборная «G-Drive», апярэдзіўшы сапернікаў з «Разанскага праспекта».**



КВЗшнікі спаборнічалі ў трох конкурсах. «Прывітанне» ўяўляла сабой прэзентацыю каманды, у «Сітуацыі» гульцы апаратыўна і арыгінальна адказвалі на нестандартныя пытанні. Творчае майстэрства ацэньвалі ў «Музычным фрыстайле».

У склад журы ўвайшлі генеральны дырэктар «Першага канала» Канстанцін Эрнст, рэжысёр тэатра і кіно, тэлевядучы і пастаянны член журы КВЗ Юлій Гусман, прадзюсар, сцэнарыст і акцёр Вячаслаў Муругаў, тэлевядучы Валдзіс Пельш, акцёр Дзмітрый Харацьян і спявачка Пелагея.

БДУ прадставілі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі на чале з чацвёртакурснікам Маркам Вялічкам.

Адбор у фінальную гульню прадугледжвае на працягу сезона правядзенне пяці гульняў 1/8 фіналу, трох чвэрцьфіналаў і двух паўфіналаў. Сезон наступнага адборнага тура пройдзе з красавіка да мая ў Маскве.

У чвэрцьфінале Вышэйшай лігі КВЗ сыграе яшчэ адна беларуская каманда — «Доктар Хаус» (Магілёў), якая заняла ў 1/8 фіналу трэцяе месца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*І сабе, і людзям*

# БАРЫСТА ТОЙ, ХТО ДАГАДЗІЦЬ УМЕЕ

## Смачным напоем і добрым словам



**Нядаўна выпала магчымасць пабываць у адной цудоўнай сталічнай установе грамадскага харчавання. Каву тут гатуе 21-гадовы барыста Аляксей АНДРЭЙЧУК. Малады чалавек робіць толькі першыя крокі на гэтым шляху, аднак пра справу, якой займаецца, і духмяны напой ведае шмат. Хлопец расказаў пра сваю прафесію, важныя складнікі добрай кавярні, а таксама раскрыў некаторыя сакрэты правільнага выбару духмяных зярнят.**

— Я пачаў шукаць работу, бо надышоў час злазіць з шыі бацькоў і забяспечваць сябе самому. Спачатку хацеў стаць афіцыянтам, аднак мяне нікуды не бралі. Цяпер гэтаму вельмі рады *(смяецца)*, бо знайшоў тое, што па душы, прычым з працоўнай дзейнасцю мне ўдаецца сумяшчаць і вучобу, — расказаў Аляксей. — Я студэнт чацвёртага курса БНТУ, факультэта маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва, па спецыяльнасці — будучы маркетолаг-эканаміст. Адна з маіх курсавых работ была звязана з вывучэннем кавамашын. Я так пагрузіўся ў тэму, што з цягам часу ўсё гэта, можна сказаць, і прывяло ў кававую індустрыю. Зразумеў, што хачу стаць барыста і што, напэўна, гэта мой лёс.

На той момант хлопец ужо ведаў усю тэорыю пра каву, аднак не было ніякай практыкі. Нарэшце суразмоўніку пашчасціла: яго запрасілі на гутарку ў адну буйную сетку кавярняў. Менавіта там і паказалі, як трэба гатаваць сапраўдную каву. Аднак калі ён пачаў працаваць, зразумеў, што яго навучылі толькі дзесяці працэнтам ад таго, што барыста павінен ведаць і ўмець. Таму давялося на практыцы спасцігаць усё астатняе метадам спроб і памылак.

— Лічу, што прафесіі неабходна вучыцца ў двух выпадках: калі гэта дакладна «тваё» ці калі хочаш зарабляць грошы. Я не вельмі добра стаўлюся да чыстага заробляння: трэба, каб тое, што робіш, яшчэ і задавальняла, — працягнуў Аляксей. — Мне вельмі падабаецца сам працэс прыгатавання кавы, а таксама стасункі з рознымі людзьмі. Праўда, іншым разам даводзіцца мірыцца з дрэнным настроем гасцей, бывае, што сутыкаешся з людской агрэсіяй. Мне неяк удаецца з гэтым спраўляцца.

Увогуле, хто такі добры барыста? Найперш гэта чалавек, які можа расказаць пра каву ўсё, па-другое, добра яе прыгатаваць. Ну і таксама вельмі важна, каб ён умеў падтрымаць, калі трэба, гутарку. У наведвальніка павінны застацца толькі добрыя адчуванні, настрой і думкі. Смачная ж кава — гэта калі пасля першага глытка вам сапраўды смачна: па выразе твару можна зразумець, ці так гэта. Звычайна я назіраю за чалавекам, і калі той усміхаецца — значыць, у мяне атрымалася яму дагадзіць. І галоўная ўмова, на якую не трэба забывацца, — напой павінен гатавацца з любоўю!

— А можаце даць некалькі парад, як выбраць якасную каву ў звычайным гіпермаркеце?

— Калі будзеце браць у краме, неабходна звяртаць увагу на ўзровень абсмажвання, яно павінна быць сярэдняе. Цёмнае будзе вельмі гарчыць. Глядзіце і на дату абсмажкі: калі даўнейшая за год, напой не будзе свежы і смачны. На некаторых пачках ёсць спецыяльныя клапаны — калі націснуць на пачак, праз іх можна адчуць водар кавы, — адказвае барыста. — І ўсё ж такі я за тое, каб піць яе ў кавярні. Ёсць такое выслоўе: «Кава — гэта цэлая атмасфера». Не толькі сам духмяны напой павінен быць смачным — тут яшчэ вельмі важна, як вы адчуваеце сябе, ці ўтульна вам ад знаходжання ў гэтым месцы.

Увогуле, калі гаварыць пра пастаяннага наведвальніка кавярняў, можна паспрабаваць скласці вобраз гэтага чалавека. Так, ён дакладна любіць каву і не шкадуе грошы на якасны напой, мае добры густ і цудоўна разбіраецца ў гатунках. Каваман не супраць пакаштаваць навінку, аднак усё ж звычайна заказвае нешта прывычнае для сябе. Часцей гэта класіка: эспрэса, амерыкана, капучына, латэ і г. д.

— Некалі Іосіф Бродскі пісаў, што «калі не пачаць дзень з філіжаначкі свежай кавы, то навошта тады падымацца...»

— *(Смяецца.)* Я цалкам згодны з ім, бо для мяне кава — таксама пачатак, старт дня. Сапраўды, толькі з гэтага смачнага напою ў мяне пачынаецца дзень.

**Надзея ЗУЕВА, фота аўтара.**

*Свой выбар*

# «Я — З СЁМАГА ПАКАЛЕННЯ», або Прыцягненне педагагічнай прафесіі

**Васямнаццацігадовы мінчанін Арцём КАСЦЯЛЕЙ не ўяўляе свайго жыцця без навукі. Ён вучыцца на першым курсе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, штодзень паглыбляе веды на факультэце прыродазнаўства. Лічыць, што такая любоў дасталася яму ад сваякоў — у родзе Касцялеяў ажно сем пакаленняў педагогаў!**

— У школьныя гады мама заўсёды казала мне: гэта тваё жыццё, твой выбар — вучыцца ці не вучыцца. Таму ніколі крытычна не ставілася да адзнак. Але я сам імкнуўся да ведаў: вялікую ўвагу ўдзяляў хіміі і біялогіі, мовам і літаратурам, браў удзел у розных канферэнцыях і алімпіядах. Мне падабаліся амаль усе прадметы, магчыма, таму скончыў школу з залатым медалём. А яшчэ спяваў, хадзіў на бальныя танцы, у тэатральны гурток... Іншымі словамі, хацеў паспець усюды, — прыгадвае хлопец.

Яшчэ да паступлення ў Арцёма былі думкі пайсці вучыцца ў каледж на кандытара, каб у далейшым адкрыць сваю кавярню. Або ў Акадэмію мастацтваў. Як творчай асобе, вызначыцца яму было цяжка. Але калі дакладна зразумеў, што хоча быць педагогам, спачатку падтрымкі з боку родных і настаўнікаў... не сустрэў.

— Яны вельмі хвалявaліся за мяне, бо па словах вопыце ведалі, што гэта нялёгкая прафесія. Але праз пэўны час змірыліся. Калі летась паступіў ва ўніверсітэт, адразу знайшоў для сябе новае хобі — гуляў у КВЗ, праўда, да першай сесіі *(усміхаецца)*. Аказалася, сумяшчаць і вучобу, і розныя забавы не вельмі проста. Таму цяпер засяродзіў увагу толькі на першым, бо для мяне важней развівацца менавіта ў гэтым кірунку.

Суразмоўнік расказаў, што пра вялікую сямейную дынастыю педагогаў даведаўся падлеткам за чарговым чаяваннем са сваякамі. І гэтае адкрыццё яго вельмі зацікавіла.

— Пазней, у дзясятым класе, у якасці задання нам прапанавана было зрабіць генеалагічнае дрэва. Тут мы з бацькамі і прасачылі сувязь пакаленняў, пачынаючы з XIX стагоддзя. Большую частку радаслоўнай адналялі са слоў бабулі Зіны,



роднай сястры маёй бабулі, бо менавіта яна цікавілася гісторыяй роду. Высветлілася, што родапачынальнікам быў мой прапрапрапрадзед Ануфрый. Ён выкладаў у царкоўна-прыходскай школе прыродазнаўчыя навукі. Даведаліся і пра дальняга сваяка Марка. Да пачатку Першай сусветнай вайны разам з сям'ёй ён пераехаў у Чыкага, дзе заснаваў дыяспару і пачаў выкладаць славеснасць. Яго дачка — прабабка Люба — праз некаторы час пераехала назад на малую радзіму ў Капыльскі раён. Разам з сабою прывезла золата — падарунак ад бацькоў. Выйшла замуж за самага пісьменнага чалавека ў вёсцы Міхаіла, які добра гаварыў па-нямецку. У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі фашысты хацелі спаліць вёску, сужэнцы адкупіліся ад іх сямейным набыткам.

Яшчэ адна прабабка Арцёма — Марыя з вёскі пад Капылём — выкладала ў школе хімію і біялогію. Яе муж Мікалай — выяўленчае мастацтва, фізкультуру і музыку: у свой час ён выступаў і на розных вяселлях, і нават на Дні Перамогі ў Маскве. Напэўна, ад яго хлопцу перадалася любоў да творчасці. Педагагічную дынастыю працягнула і бабуля Арцёма Таццяна Мікалаеўна Качан. Яна скончыла Магілёўскае педагагічнае вучылішча і адпрацавала больш за 30 гадоў выхавальніцай у дзіцячым садку.

— Памятаю, у дзяцінстве вадзіла з сабою на работу. Я сачыў за тым, як яна старалася да малых, і мяне гэта прываблівала. Цяпер бабуля ўжо на пенсіі, але часам прызнаецца, што сумуе па працы. Ды і калегі яе вельмі любяць і паважаюць, дагэтуль прапануюць вярнуцца да дзяцей, — расказвае Арцём. — Ведаю, што бацькі бабулі не жадалі, каб яна станавілася педагогам, у сваю чаргу бабуля таксама не хацела, каб мая матуля была настаўніцай. Цяпер мама працуе ў мінскай школе, дзе калісьці я вучыўся, выкладае там чарчэнне, мастацтва і абслуговаючую працу ў дзяўчынак. Усё ж такі нейкая невядомая сіла прыцягвае наш род менавіта да гэтай прафесіі.

Дарэчы, дзядзька нашага суразмоўніка, мамін брат Яўген, скончыў той жа ўніверсітэт, дзе вучыцца яго пляменнік. Па адукацыі ён выкладчык хіміі і біялогіі, такая ж спецыяльнасць будзе значыцца і ў дыпломе Арцёма. Ёсць і родны брат Алёша, яму пяць гадоў. Але пакуль што ён, як і многія дзеці ў яго ўзросце, вельмі часта мяняе свае рашэнні наконт будучай прафесіі.

— Спачатку хацеў стаць рамонтнікам тэлевізараў, зараз — мастаком ці настаўнікам у школе. Не здзіўлюся, калі ён сапраўды абярэ той жа шлях, што і мы. Наконт сябе магу сказаць: спадзяюся, што стану добрым педагогам, што мяне будуць любіць і паважаць дзеці. Нават калі адправяць на адпрацоўку ў вясковую школу — ахвотна пагаджуся!



***Справа налева ў верхнім радзе:* дзядуля, матуля, бабуля Арцёма, *у сярэднім радзе* — прабабуля і прадзядуля, *у ніжнім* — дзядзька Яўген.**

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

# АСВОІЦЬ ПРАСТОРУ

## У ШТО «РУБЯЦЦА»?

— Гульняў, прыдатных для турніраў па кіберспорце, вельмі шмат. Існуюць спецыяльныя крытэрыі. Самы важны — гэта тое, што павінны быць спаборніцкі складнік, канкрэтныя правілы і першапачаткова роўныя ўмовы. Іншымі словамі, на самым старце не можа быць перавагі ў нейкай каманды толькі таму, што яна купіла, заплаціла ці яшчэ што, — працягвае суразмоўнік.

**Для кіберспартсменаў добры адпачынак не менш важны, чым доўгія трэніроўкі.**

Па статыстыцы, самай папулярнай гульнёй у Беларусі з'яўляецца Dota 2 — 60 працэнтаў выбіраюць менавіта яе. Удзельнічаюць каманды па пяць чалавек, і іх мэта — зруйнаваць галоўны будынак на варожай базе. Потым ідзе Counter-Strike. Яна ў жанры шутара, місіяй з'яўляецца выкананне заданняў карты і знішчэнне праціўнікаў. Ну і, вядома ж, FIFA — футбольны сімулятар.

## ГЕЙМЕР ЦІ СПАРТСМЕН

— Часта многія блытаюць паняцці, а насамрэч гэта зусім розныя гульцы. Для першага асноўнае — атрымаць задавальненне, пазітыўныя эмоцыі. Ён прайшоў узровень, пахваліўся перад сябрамі і з чыстым сумленнем пайшоў піць гарбату. Кіберспартсмен ставіць перад сабой галоўную задачу — перамагчы. Прычым не проста на нейкім узроўні, а адтачыць майстэрства да такой ступені, каб так было заўсёды і пры любых абставінах. Акрамя гэтага, геймеры часцей за ўсё гуляюць у адзіночку, а кіберспорт — больш камандная гульня, — расказвае дырэктар па камунікацыях.

Яе фарміраванне — доўгі працэс. Спачатку каманды ўтвараюцца на падставе аматарскай цікавасці. Сярод сваіх сяброў знаходзяць аднадумцаў, пачынаюць гуляць, і іх зацягвае. Каманда бярэ ўдзел у розных спаборніцтвах, на якіх удзельнікі знаёмяцца адно з адным. Часта на турнірах моцныя гульцы заўважаюць сапернікаў, якія падыходзяць па ўзроўні і магчымасцях. Тады фарміруюць новыя кааліцыі. Такія каманды пачынаюць займацца кіберспортам на больш сур'ёзным узроўні.

## КАМП'ЮТАРНАЯ ЗАЛЕЖНАСЦЬ

— Для таго каб перамагаць на турнірах, трэба шмат трэніравацца. Звычайна гульцы адводзяць на гэта ад дзвюх да шасці гадзін удзень. Калі ж рыхтуюцца да спаборніцтваў, то трэніроўкі займаюць ад васьмі да дзесяці гадзін. Часам спартсмены нават здымаюць жыллё, каб ніхто не адцягваў іх увагу. Ад такой вялікай колькасці часу, праведзенай за маніторам, некаторыя думаюць, што ў кіберспартсменаў узнікае камп'ютарная залежнасць. Гэта зусім не так. Для гульцоў кіберспорт — гэта прафесія. Як бы ні любілі яе, па прыходзе дадому вы ж не будзеце ўвесь час займацца ёй яшчэ і дома?!



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Ягор тлумачыць, што для кіберспартсменаў добры адпачынак не менш важны, чым доўгія трэніроўкі. За час падрыхтоўкі яны стамляюцца разумова (ствараючы стратэгіі і разлічваючы хады), эмацыянальна (хвараючы за каманду і ход гульні) і, вядома, фізічна (бо не кожны здольны прабыць у сядзячым становішчы больш за шэсць гадзін). Некаторыя прафесійныя каманды нават наймаюць трэнераў з розных відаў спорту, напрыклад футбола ці валейбола, каб падтрымліваць стан кіберспартсменаў.

## ДАРАГОЕ ЗАХАПЛЕННЕ

— Кіберспорт — даволі выдатковы занятак, калі збіраешся займацца ім прафесійна. Камп'ютарная мышка каштуе каля 100 долараў, клавіятура — 150, а яшчэ ж патрэбны манітор, праектар для спаборніцтваў і многае іншае.

**Самай папулярнай гульнёй у Беларусі з'яўляецца Dota 2 — 60 працэнтаў выбіраюць менавіта яе.**

Арганізацыя саміх спаборніцтваў гэтак жа патрабуе вялікай матэрыяльнай і тэхнічнай падтрымкі. Беларуская федэрацыя кіберспорту кожны год складае іх цыкл. На гэты год асноўнай з'яўляецца серыя МЭТА. У ёй будзе восем турніраў па Dota, Counter-Strike і FIFA. Гэтак жа да іх далучацца турніры па Mobile, МЭТА Mobile. З мая федэрацыя плануе запусціць анлайн-лігу для непрафесійных камандаў, каб яны ўвесь час маглі паміж сабой спаборнічаць.

## ПАРАДЫ БАЦЬКАМ

— Чамусьці ўсе ўпэўнены, што дзецям камп'ютарныя гульні прыносяць толькі шкоду, і пра тое, каб яны сталі кіберспартсменамі, у многіх бацькоў і думак няма. Я лічу, што ў гэтыя кірунак хлопчыкі і дзяўчынкі могуць уваходзіць гадоў з дванаццаці. Іншая рэч, што існуюць абмежаванні ад стваральнікаў гульняў. Напрыклад, займацца Dota можна з шаснаццаці гадоў. Удзел у спаборніцтвах па «кантры» — з 16-18. Але, нягледзячы на абмежаванні па ўзросце, з пісьмовым дазволам ад бацькоў у турніры могуць удзельнічаць усе ахвотныя, — паведаміў суразмоўнік.

**«Некаторыя думаюць, што ў кіберспартсменаў узнікае камп'ютарная залежнасць. Гэта зусім не так».**

Знаёмячыся з удзельнікамі, мы і самі пераканаліся ў тым, што большасць з іх — гэта падлеткі і моладзь, якія прыехалі на турнір з розных куткоў Беларусі. Так, напрыклад, Алена Лочка са сваім сынам — з Брэста. Хлопчык ужо доўгі час захапляецца кіберспортам, і мама яго ў гэтым абсалютна падтрымлівае.

— Для бацькоў, чые дзеці шмат гуляюць у камп'ютарныя гульні, я магу даць некалькі парад. Спачатку трэба разабрацца, у якія і з якой мэтай. Часта тое, чым яны займаюцца — гэта зусім не кіберспартыўныя дысцыпліны. У такім выпадку лепш паспрабуйце зацікавіць дзіця больш карыснай гульнёй, — раіць Ягор. — Калі ўсё ж такі яна адносіцца да кіберспорту, высвятліце дасягненні і рэйтынг. А галоўнае — падтрымлівайце, бо, магчыма, кіберспорт — гэта яго прызванне.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

В связи с утерей считать недействительным страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 1273937; страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВВ № 4924752-4924755, 8110906-8110907, 8829592-8829595, серии НА № 0913831,0917377; по договорам страхования, заключенным с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серия БК № 0348661.

УНП 100706519

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об аукционе**

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 451/С-15727 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – кафе детское «Теремок»), площадью 65,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, д. 1А.
Подсобное помещение указанного капитального строения площадью 5,8 кв. м передано в аренду по договору № 33 от 10.06.2019 г. Дата окончания действия договора аренды – 31.05.2020 г.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422350100002001154, площадью 0,0151 га (назначение – для обслуживания кафе детское «Теремок»), находящемся по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, д. 1А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадью – 0,0151 га

**Начальная цена продажи – 8280 руб.** (восемь тысяч двести восемьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 828 руб. (восемьсот двадцать восемь рублей)

**Продавец** – Дятловский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, тел. 8-01563-216-82

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 31 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3–209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku, https://grino.by/aukcion/**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**
**Последний день приема заявлений – 27 марта 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

**Местный фонд развития «Старт-Восток» сообщает о дальнейшем продолжении своей деятельности**

Количество учредителей фонда – 5 человек (Листопадов Николай Федорович, Маслаков Сергей Геннадьевич, Воропаев Алексей Владимирович, Макаревич Ольга Александровна, Кравцов Сергей Михайлович).

Стоимость имущества фонда, переданного учредителями фонда, – 2100,00 руб.

Поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий – 40308,70 руб.

Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности – 1060,00 руб.

Иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления – 22,38 руб.

Расходы, понесенные фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе, – 18 346,39 руб.

Унитарные предприятия, хозяйственные общества, созданные фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе участие фонда в таких юридических лицах – нет.

УНП 790613275

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о созыве очередного (годового за 2019 г.) общего собрания акционеров ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис»**

Собрание состоится 20.03.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, к. 318. Собрание проводится по инициативе и решению Совета директоров общества.

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 10.40 до 11.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет генерального директора о результатах деятельности ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2019 год и основные направления развития Общества на 2020 год.
2. Отчет и заключение ревизионной комиссии ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» о результатах деятельности за 2019 год.
3. Об аудите Общества по результатам финансово-хозяйственной деятельности ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2019 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2019 год.
5. Распределение чистой прибыли за 2019 год.
6. О выплате дивидендов за 2019 год.
7. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи в 2019 г.
8. О порядке распределения чистой прибыли ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» на 2020 г.
9. Об избрании членов Совета директоров ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».
10. Об избрании ревизионной комиссии ОАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».

С информацией касающейся вопросов, включенных в повестку дня, лица имеющие право на участие в общем собрании могут ознакомиться с 18 по 19 марта 2020 года в рабочие дни с 10.00 по 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, комн. 313, а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Участникам собрания для регистрации необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий их личность, представителям акционера – также надлежащим образом оформленную доверенность.

УНП 100123046

**ОТЧЕТ**
**Местного благотворительного фонда «Безопасные дороги» (далее – Фонд) об использовании своего имущества в 2019 году**

Согласован протоколом заседания Попечительского совета Фонда № 2 от 24.02.2020.

| № п/п | Сведения, обязательные для включения в состав отчета | Информация Фонда |
|---|---|---|
| 1 | **Информация о количестве учредителей Фонда** | **1. Совместное закрытое акционерное общество «Безопасные дороги Беларуси»** (зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом от 23.12.2011 за регистрационным номером 191694101)<br>2. Физическое лицо **Курносенко Дмитрий Владимирович** (гражданин Республики Беларусь) |
| 2 | **Информация о стоимости имущества Фонда** | 1. Стоимость имущества, переданного учредителями фонда: **2450,00** белорусских рублей.<br>2. Поступления от проводимых в 2019 году мероприятий в соответствии с уставом фонда: **45 364,33** белорусского рубля, **10 000** евро.<br>3. Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления в 2019 году **отсутствовали** |
| 3 | **Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе** | **60 795,8** бел. руб. |
| 4 | **Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии фонда в таких юридических лицах** | В 2019 году Фонд не создавал унитарных предприятий или хозяйственных обществ, не становился участником в таких юридических лицах |

УНП 194905748

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в оперативном управлении Госпромнадзор

**Лот № 1:** гараж, инв. № 500/D-708062620, площадь 21,9 кв. м. **Начальная цена с НДС – 7939,46 руб.** Задаток – 800,00 руб.; **Лот № 2:** гараж, инв. № 500/D-708062621, площадь 21,8 кв. м. **Начальная цена с НДС – 7905,86 руб.** Задаток – 800,00 руб.; **Лот № 3:** гараж, инв. № 500/D-708062622, площадь 22,7 кв. м. **Начальная цена с НДС – 8230,60 руб.** Задаток – 850,00 руб.; **Лот № 4:** гараж, инв. № 500/D-708062623, площадь 22,6 кв. м. **Начальная цена с НДС – 8197,02 руб.** Задаток – 850,00 руб.; **Лот № 5:** гараж, инв. № 500/D-708062624, площадь 22,5 кв. м. **Начальная цена с НДС – 8157,83 руб.** Задаток – 850,00 руб.; **Лот № 6:** гараж, инв. № 500/D-708062625, площадь 21,8 кв. м. **Начальная цена с НДС – 7905,86 руб.** Задаток – 800,00 руб.; **Лот № 7:** гараж, инв. № 500/D-708062626, площадь 21,1 кв. м. **Начальная цена с НДС – 7653,91 руб.** Задаток – 800,00 руб. **Местонахождение** лотов: г. Минск, ул. Автомобилистов, 2А-3, 2А-4, 2А-5, 2А-6, 2А-7, 2А-8, 2А-9

**Условия:** 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона после предъявления Продавцу копии платежного документа об оплате стоимости услуги и стоимости затрат Организатора аукциона на организацию и проведение аукциона. 2. Порядок расчетов за приобретенный на аукционе Объект(-ы) согласовывается Продавцом и Покупателем при заключении договора купли-продажи. 3. Оплатить стоимость услуг и стоимость затрат Организатора аукциона на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609, составляет 1000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 12.03.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. **Продавец:** Госпромнадзор, г. Минск, ул. Казинца, 86/1, тел. 8 (017) 398-33-06.

**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **12.03.2020** (Госпромнадзор, Лот №_). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Окончание приема заявлений – **10.03.2020** в 11.00. Первое извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.12.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Отчет об использовании имущества Местного культурного фонда «Традиция»

Местный культурный фонд «Традиция», зарегистрированный главным управлением юстиции Мингорисполкома 13 января 2010 года, создан одним учредителем.

С учетом переоценки стоимость основных средств составляет 3792,98 (три тысячи семьсот девяносто два белорусских рубля 98 копеек). Предпринимательская деятельность фондом не осуществлялась.

За отчетный период с привлечением волонтеров и силами учредителя редактировался портал об исторической реконструкции в Беларуси. Также указанными силами был осуществлен ряд культурных мероприятий совместно с клубом исторической реконструкции «Вилькомир» при ГУО «ЦДО ДиМ «Эврика» в школах-интернатах и детских домах Беларуси. Учредителем фонда уплачивается арендная плата в размере – 40 (сорок) бел. руб. Иных расходов за отчетный период фонд не имел.

Унитарных предприятий, хозяйственных обществ фондом не создавалось, также фонд не участвует в таких юридических лицах.

УНП 194901372

**Финансово-образовательный местный фонд «Уолл-Стрит»** (далее – Фонд) зарегистрирован решением Главного управления юстиции Минского городского исполнительного комитета № 16 от 3 мая 2016 г. Свидетельство о государственной регистрации № 05/0082. Учетный номер плательщика 194904583. Адрес местонахождения: 220140, г. Минск, ул. Домбровская, д. 9, офис 9.1.4.

**ОТЧЕТ**
**об использовании финансово-образовательным местным фондом «УоллСтрит» своего имущества за 2019 год.**

Учредителями Фонда являются граждане Республики Беларусь (два физических лица).

Стоимость имущества Фонда по состоянию на 1 января 2020 года составляет – 38 472,99 бел. руб. Стоимость имущества Фонда по состоянию на 25 февраля 2020 года составляет – 31 548,61 бел. руб. Фонд не создавал, не учреждал и не участвует в унитарных предприятиях и хозяйственных обществах.

В 2019 году Фонд производил следующие виды расходов: на оплату труда работников (включая начисления); на служебные командировки, деловые поездки и встречи; на содержание арендованного и иного имущества (транспорт, офисное оборудование, иное); на приобретение основных средств, инвентаря и иного имущества; на уплату налогов и прочих обязательных платежей в бюджеты различного уровня, на услуги сторонних организаций (реклама, услуги связи). Всего было израсходовано денежных средств на сумму – 1 931 361 бел. руб.

Фондом, в процессе проведения социальных мероприятий, было использовано имущество в виде сувенирной, печатной и канцелярской продукции, с ее передачей на безвозмездной основе физическим лицам.

Фонд на возмездной основе предоставил микрозаймы физическим лицам, осуществляющим ремесленную деятельность, деятельность по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма, ведение личного подсобного хозяйства, являющимся собственниками имущества, учредителями (участниками) коммерческих организаций на общую сумму – 544 918 бел. руб.

Фонд получил поступления денежных средств от деятельности по предоставлению микрозаймов и от иных поступлений, не запрещенных законодательством, в размере – 1 932 087 бел. руб.

## ОТЧЕТ
### Международного фонда развития сельских территорий об использовании своего имущества (далее – Фонд) за 2019 год

Количество учредителей Фонда – 9, из них 8 – физические лица.

Информация об использовании имущества Фонда:

На осуществление уставных мероприятий в Фонд поступило в 2019 году:

- целевое финансирование на реализацию проектов иностранной безвозмездной помощи и международной технической помощи, проводимых в соответствии с уставом Фонда, поступило 206 884,02 бел. руб., 9660 евро и 19 994,00 доллара США.

- доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой Фондом, составили – 10 867,26 бел. руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей согласно Уставу Фонда, составила – 200 741,00 бел. руб.

Общая стоимость активов Фонда на 01.01.2020 года составляет – 35 956,24 руб., в том числе стоимость активов в денежной форме в размере – 24 937,79 руб.

Фонд имеет филиал, расположенный на территории Французской Республики по адресу: д. 5, улица Жозеф и Мари Хакин, 75116, Париж.

Фонд является участником потребительского кооператива «Республиканский микрофинансовый центр», Протокол Правления фонда № 5 от 23.06.2009 г.,

Фонд не является учредителем иных унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

УНП 805000817

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже когенерационной установки JMC 620GS-N.L ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (Продавец)

**Лот № 1.** Когенерационная установка JMC 620GS-N.L, производства австрийской фирмы «JenBacher», состоящей из двух модулей. г. в. – 2009. Адрес: Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6. **Начальная цена с НДС – 7 621 830,74 бел. руб.** Задаток – 381 091,54 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %

**Аукцион состоится 20.03.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

